Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

18 ВЕРАСНЯ 2015 г. ПЯТНІЦА № 179 (28037) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Выбары–2015

Праграма кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі

СТАР. 2

«Жамчужыны» сівіцкай зямлі

СТАР. 5

Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

20 КАНАЛАЎ

ЦЫТАТА ДНЯ

Андрэй ШОРАЦ, старшыня Мінгарвыканкама:

«На сённяшні дзень жыхарамі Мінска з'яўляюцца 1 млн 938 тыс. чалавек. Толькі ў Дзень горада ў сталіцы нарадзілася 38 хлопчыкаў і 32 дзяўчынкі. Дзяржава будзе і далей падтрымліваць людзей, якія прынялі рашэнне стаць бацькамі. Дарэчы, двухмільённаму жыхару сталіцы плануецца паднесці ў падарунак кватэру. Калі ён народзіцца ў шматдзетнай сям'і, то і кватэра будзе большай. Я заклікаю ўсіх мінчан павышаць дэмаграфічную бяспеку краіны і павялічваць насельніцтва нашага любімага горада».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.09.2015 г.

Долар ЗША	17636,00	▼
Еўра	19963,00	▲
Рас. руб.	269,13	▲
Укр. грыўня	816,48	▲

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 15179>

Імя ім — Маладосць

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Студэнты БНТУ.

■ Крок наспеў

АБАРАНІЦЬ ПАКУПНІКА АД НЕЗРАЗУМЕЛАГА ТАВАРУ

На рынку павінны застацца толькі добрасумленныя імпарцёры

Увядзенне санітарна-гігіенічнай экспертызы прадукцыі замежнай вытворчасці з'яўляецца часовым захадам, заявіў намеснік міністра аховы здароўя — галоўны санітарны ўрач Беларусі Ігар ГАЕЎСКІ. «Пастанова №666 — часовая мера. Як толькі яна запрацуе, будзе разгледжана магчымасць прыняцця іншага рашэння». Паводле яго слоў, дзяржава не зацікаўленая ў «перакантролі» і наяўнасці дадатковых бар'ераў. Мэта, якая пераследуецца, заключаецца ў прысутнасці на рынку толькі празрыстага тавару, які можна прасачыць. «Сёння прысутнічае столькі незразумелага тавару на рынку, што яго заўважаюць нават пакупнікі». Як адзначыў Ігар Гаеўскі, мера, звязаная з увядзеннем абавязковай санітарна-гігіенічнай экспертызы імпарту, наспела абгрунтавана. «Трэба набрацца адвагі і зрабіць тое, што просяць. Далей усё стане на свае месцы. Тыя, хто не хоча выконваць патрабаванні, пакінуць рынак».

Ігар Гаеўскі заклікаў пастаўшчыкоў імпартных тавараў, на якія ўведзена абавязковая дзяржаўная санітарна-гігіенічная экспертыза, актыўна карыстацца паслугамі «гарачых ліній», арганізаваных Міністэрствам аховы здароўя. «Працуюць «гарачыя лініі»: у міністэрстве, дзве — у Рэспубліканскім цэнтры гігіены і эпідэміялогіі і па адной — у абласных і занальных гарадскіх цэнтрах гігіены і эпідэміялогіі. Там можна высветліць нюансы». Акрамя таго, на «гарачыя лініі» можна паведамляць факты неправамоцных дзеянняў супрацоўнікаў санітарных службаў. «Калі нехта заявіўся, але бачыць, што цыганіна, незразумела, што робяць, адразу рабіце званок. Паверце: любы званок — прамое даручэнне, адразу разбіраемся. Працэс будзем трымаць на ручным кіраванні», — запэўніў ён. Ігар Гаеўскі канстатаваў, што адно з найбольш частых пытанняў — аб тэрмінах правядзення экспертызы.

СТАР. 4

■ Надвор'е

КРЫХУ ПАХАЛАДАЕ, І ДАЖДЖЫ

А ў суботу айчынныя спецыялісты прадказваюць у асобных раёнах нават моцныя ліўні

На выхадных у Беларусі будзе панаваць няўстойлівае надвор'е, якое прынясе да нас атмасферны фронт з боку краін Заходняй Еўропы, пра што паведамляюць спецыялісты Белгідраметцэнтра.

Аднак сёння на тэрыторыі краіны яшчэ захаваецца анамальна цёплае надвор'е. Будзе пераважна без ападкаў. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе 21-28 цяпла, а па поўдні месцамі паветра прагрэецца да плюс 30 градусаў.

На жаль, непасрэдна на выхадныя надвор'е пагоршыцца. У гэтыя дні на тэрыторыю краіны завітае сур'ёзны атмасферны фронт з поўдня Польшчы, які і «падкіне» нам вільгаці. Неба зацягне аблокамі, пройдуць дажджы, а тэмпература панізіцца. Але яна па-ранейшаму будзе вышэйшай за сярэднія шматгадовыя значэнні на гэты час. Чакаецца, што ў суботу ўначы месцамі, а раніцай і ўдзень на большай частцы тэрыторыі Беларусі пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах прагназуюцца навальніцы і моцныя ліўні. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 11-17 градусаў, удзень будзе 16-23 цяпла, па паўднёвым усходзе — плюс 24-28 градусаў.

СТАР. 4

ЗА БУДУЧЫНЮ НЕЗАЛЕЖНАЙ БЕЛАРУСІ

ПЕРАДВЫБАРНАЯ ПРАГРАМА КАНДЫДАТА Ў ПРЭЗІДЭНТЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ЛУКАШЭНКІ АЛЯКСАНДРА РЫГОРАВІЧА

Дарагія суайчыннікі!

11 кастрычніка кожнаму з вас трэба будзе выбіраць будучыню. Будучыню сваю, будучыню дзяцей і ўнукаў, будучыню ўсёй Беларусі.

Ад вашага выбару залежыць многае. Бо па сутнасці сёння перад краінай усяго два шляхі.

Адзін шлях наперад — да захавання стабільнасці і парадку, свабоды і незалежнасці. Гэта шлях адзінства і згоды, развіцця і прагрэсу. Гэта шлях міру і стварэння.

Іншы шлях назад — да смуты і хаосу «дзевяностых», бандыцкага капіталізму і дзяльбы ўласнасці, да паслаблення дзяржавы і страты незалежнасці. Гэта шлях рэвалюцыі, крыві і вайны.

Нам нельга страціць тое, што ўжо дасягнута. Мы за два дзесяцігоддзі незалежнасці зрабілі вельмі многае.

Мы пабудавалі сваю дзяржаву — свабодную і суверэнную Беларусь.

Мы жывем у мірнай, спакойнай, прыгожай, дагледжанай краіне.

Мы стварылі сацыяльную мадэль, якая абараняе простага грамадзяніна. Збераглі грамадства ад алігархаў і бандытаў.

Наша дзяржава вельмі маладая, і наша незалежнасць не ўсім па душы. Наша зямля і наш здабытак, створаны працай усяго народа, паранейшаму вабяць аматараў лёгкай нажывы.

Таму найперш за ўсё мы павінны абараніць тое, што ўжо створана.

Свабоду і незалежнасць Беларусі.

Мір і парадак у краіне.

Дзяржаву для народа, у якой жыць нашым дзецям і ўнукам.

Абапіраючыся на гэтыя дасягненні, мы можам рухацца наперад — да матэрыяльнага дастатку, дабрабыту кожнага грамадзяніна і росквіту Беларусі.

СВАБОДА І НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ

Два дзесяцігоддзі таму мы пачалі будаваць новую краіну — **першую ў гісторыі незалежную беларускую дзяржаву.**

Стагоддзямі мы ішлі да незалежнасці. Гісторыя не літавала нас. Яна не дала нам лёгкіх шляхоў. Нашы нетры не тояць казачных багацяў — і свой хлеб мы заўсёды здабывалі цяжкай, але сумленнай працай. Нас спрабавалі заваяваць звонку і падзяліць знутры.

І ўсё ж мы здабылі нашу свабоду. Мы здабылі сваю дзяржаву. І гэты высокі гонар выпаў пакаленням, якія жывуць цяпер, — нам з вамі, кожнаму з нас.

Як першы Прэзідэнт незалежнай Беларусі магу цвёрда абяцаць вам: наша краіна ніколі не будзе ўцягнута ў чужыя войны і канфлікты. І мы заўсёды абаронім Айчыну ад любых замахаў.

Нашы дзеці, унукі і праўнукі будуць свабодна жыць на сваёй зямлі. Яны самі распарадзяцца сваім лёсам.

БЕЛАРУСЬ ЗАЎСЁДЫ БУДЗЕ СВАБОДНАЙ І НЕЗАЛЕЖНАЙ! У гэтым я бачу сваю **першую найважнейшую задачу.**

МІР І ПАРАДАК

«Што маем — не захоўваем, страціўшы — плачам», — так гаворыць народная мудрасць.

Калі вайна прыйшла да нашага парога, мы ўсвядомілі — няма нічога даражэйшага за мір. Вайна забірае ўсё — спакой, шчасце і дабрабыт. Вайна забірае самае галоўнае, тое, чаму няма цаны, — чалавечае жыццё.

Нам у Беларусі ўдаецца захаваць мір, мы не чуем стрэлаў і разрываў снарадаў, у нас ёсць магчымасць спакойна працаваць, гадаваць дзяцей і радавацца мірнаму жыццю.

І гэта не толькі заслуга ўлады. Гэта заслуга нашага мудрага народа. Мы не дазволілі захапіць сябе радыкальнымі ідэямі, заўсёды беражліва захоўвалі мір, адзінства і згоду ў грамадстве.

Найноўшая гісторыя даказала, што мы мелі рацыю. Горкі прыклад суседзяў яшчэ раз пераканаў нас.

Без міру няма жыцця.

Без спакою няма развіцця.

Без парадку няма стварэння.

ЗАХАВАЦЬ У КРАІНЕ МІР І ПАРАДАК — у гэтым я бачу сваю **другую найважнейшую задачу.**

ПРАЦА І ДАБРАБЫТ

Даць кожнаму чалавеку магчымасць зарабляць на годнае жыццё сваёй працай — гэты прынцып першапачаткова быў пакладзены ў фундамент беларускай эканамічнай мадэлі.

Захаваць прадпрыемствы, працоўныя месцы для людзей, нягледзячы на любы крызіс, — заўсёды было галоўным сэнсам нашай палітыкі. Так будзе і надалей.

Якія б крызісы ні падпільноўвалі сусветную эканоміку ці нашых суседзяў, у Беларусі кожны ахвотны заўсёды будзе мець магчымасць працаваць і зарабіць.

Пяць гадоў таму мы ставілі перад сабой вялікія задачы ў эканоміцы. Скажу прама і шчыра — не ўсё з таго, што задумвалася, атрымалася выканаць.

Мы ў поўнай меры адчулі жорсткую ўзаемазалежнасць сучаснай глабальнай эканомікі.

Не мы правакавалі сусветны эканамічны крызіс. Не мы распальвалі ваенныя канфлікты. Не мы раскручвалі спіраль узаемных санкцый.

Але ўсё гэта ўдарыла па нас, ударыла балюча і нечакана.

Нядобразычліўцы прадракалі нам абвал, крах і хаос. Але мы захавалі прадпрыемствы, калектывы, працоўныя месцы. Дзейнічаюць усе сацыяльныя праграмы. Стабілізуецца валютны рынак.

Упэўнены: мы выстаім і працягнем развіццё. Беларусь не застыне на месцы — яна энергічна рушыць наперад.

Перад сабой мы ставім тры стратэгічныя мэты: ЗАНЯТАСЦЬ, ЭКСПАРТ, ІНВЕСТЫЦЫІ.

Занятасць — гэта стабільнасць грамадства і дабрабыт людзей, магчымасць кожнаму зарабіць сабе на годнае жыццё сваёй працай.

Экспарт — гэта стабільнасць эканомікі, моцны рубель, нізкая інфляцыя, збалансаваны бюджэт.

Інвестыцыі — гэта развіццё краіны, новыя тэхналогіі і новая якасць жыцця для кожнага беларуса.

Эканамічная праграма пяцігодкі будзе заснаваная **на пяці ключавых прынцыпах.**

1. Барацьба з інфляцыяй і ростам цэн

Канкрэтныя меры:

— умацаванне даверу да беларускага рубля, устойлівы рост золатавалютных рэзерваў, падтрыманне іх на бяспечным узроўні;

— эмісія грошай у строгай адпаведнасці з патрэбай эканомікі, якая не прыводзіць да росту цэн;

— рашучая барацьба з манапалізмам з мэтай забеспячэння сумленнай канкурэнцыі на рынку і зніжэння коштаў;

— павышэнне эфектыўнасці бюджэтных расходаў, уключаючы прадастаўленне дзяржаўнай падтрымкі прадпрыемствам незалежна ад формаў уласнасці на раўнапраўнай аснове;

— скарачэнне знешняга дзяржаўнага доўгу. Мы не павінны перакладаць нашы даўгі на будучыя пакаленні.

2. Новыя падыходы да мадэрнізацыі эканомікі

У нашай краіне праводзіцца маштабная мадэрнізацыя прадпрыемстваў. Прамысловы патэнцыял за 20 гадоў павялічыўся ў чатыры разы. Пабудаваны дзясяткі новых заводаў. На сотнях прадпрыемстваў прамысловасці, аграпрамысловага комплексу, будаўнічай індустрыі ўстаноўлена сучаснае абсталяванне.

Але найлепшае абсталяванне не дасць жаданай аддачы без эфектыўнага кіравання.

Таму ў будучай пяцігодцы нам неабходна разам з абнаўленнем вытворчасцей мадэрнізаваць кіраванне.

Менавіта тады мы атрымаем рэальную аддачу ад мадэрнізацыі — заваюем новыя рынкі, прададзім прадукцыю з прыбыткам і годна заплацім кожнаму працаўніку.

Канкрэтныя меры:

— увядзенне на дзяржаўных прадпрыемствах сістэм карпаратыўнага кіравання на аснове найлепшай сусветнай практыкі;

— прыцягненне вядучых сусветных кампаній у Рэспубліку Беларусь для рэалізацыі праектаў з высокім дабаўленым коштам;

— інтэграцыя найбуйнейшых дзяржаўных прадпрыемстваў у міжнародны фінансавы рынак.

3. Эфектыўнае дзяржаўнае кіраванне

Канкрэтныя меры:

— істотнае павышэнне прэстыжу дзяржаўнай службы, удасканаленне падбору дзяржаўных служачых;

— радыкальнае скарачэнне залішніх, дублюючых функцый дзяржаўнага кіравання, кантрольных і праваахоўных органаў;

— падзел функцый дзяржавы як уласніка і рэгулятара;

— пашырэнне паўнамоцтваў і сфер адказнасці парламента, а таксама органаў мясцовага кіравання і самакіравання;

— пашырэнне пераліку дзяржаўных паслуг для грамадзян з выкарыстаннем электроннай дыстанцыйнай формы;

— далейшая дэбюракратызацыя сістэмы кіравання;

— непрымірымая барацьба з карупцыяй.

4. Прыцягненне інвестыцый, падтрымка малога і сярэдняга бізнесу

У XXI стагоддзі рухавік любой эканомікі — веды і энергія чалавека.

Таму галоўную стаўку мы зробім **на розум, энергію і прадпрымальнасць нашых людзей.** Мы яшчэ больш будзем спрыяць развіццю ініцыятывы. Маштабна падтрымаем малы і сярэдні бізнес. Ліквідуем усё, што перашкаджае яго развіццю.

Поспех прыватнага бізнесу — гэта дабрабыт не толькі прадпрымальнікаў. Гэта новыя працоўныя месцы і годны заробак для беларусаў.

Канкрэтныя меры:

— удасканаленне кантролю за функцыянаваннем бізнесу, выключэнне любых формаў неправамернага ўмяшання ў бягучую дзейнасць прадпрыемстваў;

— забарона на павышэнне старых і ўвядзенне новых падаткаў на працягу пяці гадоў. Любыя змены падаткаў — толькі ў бок змяншэння і спрашчэння;

— скарачэнне ўсіх відаў і формаў справаздачнасці, укараненне міжнародных стандартаў фінансавай справаздачнасці;

— забеспячэнне безмуойных гарантый правоў прыватнай уласнасці;

— развіццё паўнавартаснага фінансавага рынку, паэтапная лібералізацыя руху капіталу, свабодная купля-продаж акцый прадпрыемстваў усіх формаў уласнасці.

5. Адкрытасць глабальнаму свету і пабудова эканомікі ведаў

Свет мяняецца ў нас на вачах.

Новыя высокатэхналагічныя галіны эканомікі — гэта не толькі экспарт і прыток інвестыцый у краіну. Гэта цікавая, творчая і высокааплатная праца для соцень тысяч людзей, найперш за ўсё моладзі.

Адкрытасць свету і эканоміка ведаў — гэта залог нашай канкурэнтаздольнасці і выжывання ў сучаснай глабальнай цывілізацыі.

Канкрэтныя меры:

— удасканаленне сістэмы гарантый для міжнародных інвестараў на аснове найлепшай сусветнай практыкі;

— фарміраванне Беларусі як найбуйнейшага рэгіянальнага лагістычнага цэнтра;

— уваходжанне Беларусі ў лік найбольш развітых краін свету ў сферы інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій;

— удасканаленне нацыянальнай сістэмы адукацыі;

— шырокае ўкараненне ў сістэме адукацыі сучасных электронных сродкаў навучання;

— развіццё высакахуткаснага інтэрнэту, укараненне перадавых стандартаў мабільнай сувязі 4G і 5G;

— стварэнне ўмоў, пры якіх інавацыйныя выдаткі, уключаючы прыватныя інвестыцыі, дасягнуць узроўню 1,5 працэнта ВУП у год;

— заканадаўчае замацаванне перадачы дзяржавай правоў інтэлектуальнай уласнасці вучоным на створаныя імі распрацоўкі;

— стварэнне паўнавартаснай венчурнай індустрыі.

Усе пералічаныя меры ў сукупнасці забяспечаць нашай краіне новы эканамічны прарыў за кошт спалучэння эфектыўнага дзяржаўнага кіравання, прыватнай ініцыятывы і добрасумленнай працы нашых людзей.

ДАЦЬ КОЖНАМУ ЧАЛАВЕКУ МАГЧЫМАСЦЬ ЗАРАБІЦЬ НА ГОДНАЕ ЖЫЦЦЁ СВАЁЙ ПРАЦАЙ — у гэтым я бачу сваю **трэцюю найважнейшую задачу.**

САЛІДАРНАСЦЬ І СПРАВЯДЛІВАСЦЬ

Узаемадапамога, дабрыня і міласэрнасць — гэта тое, што заўсёды адрознівала нашых людзей. Дапамога хворым і слабым, абарона дзяцей і клопат аб пажылых спрадвеку лічыліся ў нас святой, богаўгоднай справай.

Гэтыя векавыя маральныя каштоўнасці мы паклалі ў аснову беларускай сацыяльнай дзяржавы — дзяржавы для народа.

Мы абавязкова захаваем сацыяльны характар нашай палітыкі.

Канкрэтныя меры:

— далейшае развіццё аховы здароўя. У будучай пяцігодцы наша медыцына па ўсіх параметрах стане ў адзін шэраг з медыцынай развітых дзяржаў;

— захаванне даступнасці якаснай медыцыны і адукацыі для кожнага грамадзяніна Беларусі;

— удасканаленне сістэмы адраснай сацыяльнай дапамогі грамадзянам і сем'ям, якія жывуць у нястачы;

— далейшае развіццё ўсіх дзеючых праграм падтрымкі моладзі;

— стварэнне сучаснай сістэмы даступнага іпатэчнага крэдытавання. У кожнай беларускай сям'і, якая рэальна мае патрэбу ў новым жыллі, будзе магчымасць пабудаваць сабе дом або кватэру;

— захаванне і развіццё ўсіх дзяржаўных праграм па абароне і падтрымцы пажылых людзей, інвалідаў, мацярынства і дзяцінства, шматдзетных сем'яў.

Кожны з нас павінен ясна разумець: усе мы калісьці былі дзецьмі і ўсе мы некалі станем пажылымі людзьмі. Шчыры клопат пра дзяцей і пажылых людзей, падтрымка і ўвага да іх заўсёды былі, ёсць і будуць нашым галоўным прыярытэтам.

РАЗВІВАЦЬ БЕЛАРУСЬ ЯК САЦЫЯЛЬНУЮ ДЗЯРЖАВУ — у гэтым я бачу **сваю чацвёртую найважнейшую задачу.**

Мірнае і шчаслівае жыццё нашых людзей стане галоўным вынікам выканання ўсяго задуманага.

Беларусь умацуе сваю незалежнасць і зробіць імклівы прарыў у будучыню.

Гісторыя не раз даказвала — адзінства і мэтанакіраванасць усяго народа здольны тварыць цуды.

ІМКЛІВА РУХАЮЧЫСЯ ПА ШЛЯХУ ПРАГРЭСУ, МЫ БУДЗЕМ РАБІЦЬ УСЁ, КАБ ПРЫВЕСЦІ БЕЛАРУСЬ У ГРУПУ САМЫХ ПЕРАДАВЫХ КРАІН СВЕТУ, — у гэтым я бачу сваю **пятую найважнейшую задачу**.

Дарагія суайчыннікі!

Усе гады на пасадзе Прэзідэнта мяне падтрымлівала вера. Вера ў Беларусь, у наш народ, у нашу будучыню.

Маю працу ацэньваць вам.

Магу сказаць толькі адно. Беларусь — мой лёс. Служэнне ёй — сэнс майго жыцця. Не было, няма і не будзе ў мяне нічога даражэйшага за Радзіму.

І сёння я цвёрда ведаю.

РАЗАМ мы стварылі незалежную Беларусь!

РАЗАМ мы пераадолеем любыя нягоды!

РАЗАМ мы пабудуем шчаслівую і квітнеючую краіну!

Нам няма чаго дзяліць і няма дзеля чаго падзяляцца.

Таму што БЕЛАРУСЬ У НАС АДНА!

■ Форум

РЫНАК ПАТРАБУЕ ІНАВАЦЫЙ

Учора на II Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі ў Сочы быў падпісаны шэраг пратаколаў аб намерах паміж беларускімі прадпрыемствамі і расійскімі кампаніямі

Наша краіна прапануе на расійскім рынку менавіта якасную і інавацыйную прадукцыю. Аб гэтым учора паведаміў старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ падчас адкрыцця сумеснай беларуска-расійскай прамысловай выставы на II Форуме рэгіёнаў у Сочы.

У прыватнасці, Міхаіл Мясніковіч адзначыў, што 20% прадукцыі, якую Беларусь пастаўляе на расійскі рынак, інавацыйная. На яго погляд, мы прадаём гэтай краіне выключна добрую, інавацыйную і канкурэнтаздольную на сусветным рынку прадукцыю. Старшыня Савета Рэспублікі звярнуў увагу, што Расія і Беларусь — індустрыяльна развітыя дзяржавы. У нас удзельная вага апрацоўчай прамысловасці ў валавым унутраным прадукце складае амаль 30%. Больш за тое, Беларусь займае 43-е месца ў сусветным рэйтынгу па індэксе ведаў. Паводле слоў Міхаіла Мясніковіча, гэтыя лічбы кажуць аб велізарным патэнцыяле, які можа быць рэалізаваны на ўзроўні міжрэгіянальных адносін дзвюх краін.

Паведамляецца, што ў пленарным пасяджэнні форуму прагназуецца ўдзел больш за 350 прадстаўнікоў заканадаўчай і выканаўчай галін улады Беларусі і Расіі, кіраўнікоў буйных прадпрыемстваў і бізнес-супольнасцей дзвюх краін.

Ёсць у гэтага мерапрыемства ўжо і першыя практычныя вынікі. Так, адкрытае акцыянернае таварыства «БелАЗ» — кіруючая кампанія холдынга «БелАЗ-Холдынг» — плануе паставіць партыю кар'ерных самазвалаў расійскаму таварыству «Будсэрвіс», пра што паведамляе прэс-служба айчыннага прадпрыемства.

Непасрэдна на форуме быў падпісаны шэраг пратаколаў аб намерах паміж нашым прадпрыемствам і расійскімі кампаніямі. Напрыклад, расійская кампанія «Будсэрвіс» плануе набыць у холдынгу 35 адзінак кар'ернай тэхнікі грузападымальнасцю 130-220 тон.

Акрамя таго, «БелАЗ» збіраецца закупіць 147 электрапрыводаў пераменнага току вытворчасці адкрытага акцыянернага таварыства «Сілавыя машыны». Таксама заключана пагадненне аб стратэгічным партнёрстве паміж беларускім прадпрыемствам, акцыянерным таварыствам «Расійскі экспартны цэнтр» і расійскім таварыствам «Вістой Груп» у галіне сумеснага прасоўвання прадукцыі і рэалізацыі комплексных інавацыйных праектаў на замежных рынках.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

ВЫБАРЫ 2015 11 кастрычніка

ДАСТУПНАСЦЬ ДЛЯ ЎСІХ

На ўчастках для галасавання будуць трафарэты для людзей, якія дрэнна бачаць

На кожным агульным участку для галасавання будзе знаходзіцца па два трафарэты для інвалідаў па зроку. Пра гэта ўчора паведаміла Лідзія ЯРМОШЫНА, старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў.

— На прэзідэнцкіх выбарах на кожным участку будзе не менш за два трафарэты, дакладней, іх запланавана ўсюды па два, — праінфармавала старшыня ЦВК. — Але гэта будзе вядома, тычыцца ўчасткаў агульных, а не закрытых. Зразумела, ніхто ў воінскія часці трафарэты накіроўваць не будзе.

Як заўважыла Лідзія Ярмошына, неабходнасць у большай колькасці трафарэтаў на кожным з участкаў наўрад ці ўзнікне.

— Не думаю, што па іх выстраіцца чарга, — лічыць старшыня Цэнтральнай камісіі.

Яна ўдакладніла, што трафарэты для галасавання людзей з парушэннямі зроку друкуюцца разам з бюлетэнямі (бюлетэняў павінна быць 7 мільёнаў 285 тысяч).

У Беларусі на сёлетніх выбарах упершыню ствараюцца ўмовы для самастойнага галасавання выбаршчыкаў, у якіх парушаны зрок. Невідушчы чалавек мае права прагаласаваць без дапамогі іншых асоб з выкарыстаннем спецыяльнага трафарэта (у яго ўкладваецца бюлетэнь), аднак гэта не выключае яго права знаходзіцца ў кабіне для галасавання з суправаджальнай асобай або скарыстацца пры запаўненні бюлетэня дапамогай іншага выбаршчыка, які знаходзіцца ў памяшканні. Такім чынам, нават атрымаўшы трафарэт або лупу для запаўнення бюлетэня, інвалід па зроку можа запрасіць у кабіну іншую асобу для аказання дапамогі ў запаўненні бюлетэня.

Міжнародныя назіральнікі пра выбары ў нашай краіне:

«ЗАКАНАДАЎСТВА ПРАЗРЫСТАЕ, А РЭГУЛЯВАННЕ СПРАВЯДЛІВАЕ»

Пра гэта заявіў учора журналістам кіраўнік маніторынгавай групы Альянс місій назіральнікаў Генрых КРОНЕР.

Ён адзначыў, што зусім нядаўна прыбыў у Беларусь і пакуль не гатовы даваць нейкія падрабязныя ацэнкі. Але пры гэтым Кронер сказаў, што ўжо былі праведзены сустрэчы з прадстаўнікамі органаў дзяржаўнай улады. Першыя ўражанні назіральнікаў пазітыўныя. «Заканадаўства празрыстае, і рэгуляванне выглядае вельмі справядлівым. З гэтага пункту гледжання, думаю, будуць добрыя выбары», — адзначыў ён. Акрамя таго, Генрых Кронер паведаміў, што назіральнікі Альянсу разлічваюць пагутарыць з кандыдатамі ў Прэзідэнты, журналістамі, якія асвятляюць выбары, каб даведацца пра іх меркаванне аб тым, што адбываецца.

Ханс-Юрген Загорка, другі ўдзельнік Альянсу місій назіральнікаў, адзначыў у размове з журналістамі, што настроены аптымістычна наконт таго, як арганізуюцца выбары ў нашай краіне. Па словах назіральніка, калі яны атрымаюць станоўчую ацэнку і далей сітуацыя працягне развівацца ў такім жа рэчышчы, то гэта будзе вельмі важным крокам на шляху да ўступлення Беларусі ў Савет Еўропы. Ён таксама падкрэсліў, што спадзяецца на правядзенне выбараў у пазітыўным ключы.

Альянс місій назіральнікаў — гэта група міжнародных назіральнікаў, у якую ўваходзяць Еўрапейскі інстытут Лібертас (Германія), Еўрапейскі фонд дэмакратыі (Бельгія) і альянс «Еўрапейскі інстытут дэмакратыі» (Францыя). Асноўная задача аб'яднанай групы — маніторынг выбараў Прэзідэнта нашай краіны. Назіральнікі будуць аналізаваць перадвыбарчую сітуацыю, працаваць непасрэдна ў дзень выбараў, а таксама ажыццяўляць паслявыбарнае назіранне.

Надзея АЛЕКСАНДРОВІЧ

■ Дзённік парламентарыя

ПОСПЕХ РЭФОРМ ЖКГ ЗАЛЕЖЫЦЬ АД УСІХ НАС

Аляксей КУЗЬМІЧ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве:

— Асноўныя пытанні ў людзей, калі яны сустракаюцца з дэпутатамі, — гэта ЖКГ і будаўніцтва. Яны складаюць прыкладна 70 працэнтаў тэматыкі праблем выбаршчыкаў. Справа ў тым, што жыллё, яго ўтрыманне, абслугоўванне, — жыццёвыя інтарэсы чалавека, якія датычацца кожнага менавіта сёння. Калі стан лячэбных устаноў хвалюе тых, хто хварэе, то жыллёва-камунальная гаспадарка — усіх.

Нездарма гэтай тэме кіраўнік дзяржавы надаў асаблівую ўвагу ў сваім Пасланні да беларускага народа і Нацыянальнаму сходу. Задача адпрацаваць рэформу жыллёва-камунальнай гаспадаркі на Мінску была пастаўлена новаму мэру сталіцы і новаму міністру ЖКГ, які прыйшоў з Гомеля, дзе таксама ў свой час былі ўкаранёны пэўныя навацыі.

Рэформы апрабоўваюцца на двух раёнах Мінска — Першамайскім і Партызанскім. Першамайскі быў выбарны з прычыны значнай колькасці новабудоўляў, а Партызанскі — праз вялікую долю прыватнага сектара. У гэтых раёнах праводзіцца эксперымент па змяншэнні ўплыву ЖРЭА, аб'яднанні ЖЭСаў, стварэнні рабочых груп па рамонце, дзе ЖРЭА выступае ў якасці заказчыка. Ёсць намер зрабіць цэнтральную дыспетчарскую службу па ўсім горадзе Мінску.

Безумоўна, кожная рэформа патрабуе дасканалай падрыхтоўкі. Сэнс новаўвядзенняў — палепшыць работу жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Каб людзі ведалі, за што яны плацяць грошы. Каб не было такога, што арганізацыя, напрыклад, сабрала подпісы жыльцоў пад згодай бясплатна ўсталяваць новы дамафон, а потым высвятляецца, што ключы ад гэтага дамафона трэба купляць у гэтай арганізацыі. А ў сем'ях, як правіла, пражывае па чатыры — шэсць чалавек, плюс адзін ключ патрэбны запасны.

Альбо новая прапанова ў гарадах — усталяванне відэакамер. Пры гэтым людзям не тлумачаць, як гэтыя камеры будуць працаваць і навошта яны патрэбны. Мадэрнізацыя жыллёва-камунальнай сферы павінна праходзіць так, каб людзі разумелі, што адбываецца.

Зараз актыўна абмяркоўваецца праблема асобнага збору смецця. Прапануецца нават заварыць смеццеправоды, каб людзі выносілі цвёрдыя бытавыя адходы ў асобныя кантэйнеры. Ідэя неблагая, але таксама патрабуе добрай падрыхтоўкі. Трэба, каб пляцоўка для асобнага збору смецця не стала рассаднікам пацукоў і прусакоў, каб машыны гэтае смецце вывозілі своечасова. Тут патрэбна апрабацыя на практыцы, каб усё ўлічыць.

Новаўвядзенні не ўсюды ўспрымаюцца адназначна станоўча. Людзі сталага ўзросту прызвычаіліся да старой сістэмы, да сваіх ЖЭСаў. Таму поспех рэформы залежыць не толькі ад кіраўніцтва жыллёва-камунальнай сферы, горада або раёнаў, але ад саміх людзей. Аднак памылак не бывае толькі тады, калі нічога не робіш.

Пакуль вынікі эксперымента мала асвятляюцца і абмяркоўваюцца ў СМІ. Калі б людзі ўбачылі, якімі сталі дворыкі, якія даглядаюцца па новых правілах, наколькі менш каштуе апрацоўка асобна сабранага смецця, тады б паспяховы вопыт распаўсюджваўся хутчэй. Людзей трэба зацікаўліваць у прагрэсіўных падыходах да кіравання сваім жыллём. Складана казаць пра больш танную перапрацоўку смецця, калі камунальныя паслугі датуюцца, разам з тым, калі працэнт датацыі змяншаецца, то і людзі менш сябе адчуваюць нахлебнікамі.

Мы ўжо прыйшлі да ўліку выканання работ па кожным доме. Калі я гляджу «жыроўку» і бачу, што «іншыя работы» складаюць 30 працэнтаў ад выніковай сумы, то ў мяне ўзнікаюць пытанні. Узнікаюць яны і пры вялікіх адміністрацыйных выдатках. Усе падобныя выдаткі павінны зніжацца. Але самая вялікая задача, якая стаіць перад намі, — зрабіць так, каб людзі спрабавалі самі вырашаць праблемы па абслугоўванні свайго жылля. Не закідвалі скаргамі органы ўлады, а самастойна кіравалі сваёй тэрыторыяй.

Нядаўна да мяне звярнулася жанчына з праблемай: уладальнікі 34 дачных участкаў не могуць вырашыць пытанне, ці трымаць на тэрыторыі таварыства курэй. Перапіска з органамі ўлады складае ўжо тры тамы. Трэба адвучаць людзей спадзявацца ў вырашэнні падобных праблем на чыноўнікаў.

У маім двары жыхары сабраліся на сход і дамовіліся аплаціць роспіс уваходных груп — вельмі прыгожа атрымалася. Наступны намер — зрабіць за ўласны кошт дзіцячую пляцоўку. Калі людзі самі заплацілі, яны падтрымліваюць зробленае ў добрым стане і сабак на такіх дзіцячых пляцоўках ужо не выгульваюць. І для дзяржавы карысць, і для людзей.

Адваротны бок рэарганізацыі ЖЭСаў — людзі, якія трапляюць пад скарачэнне. Калі з 15 службаў пакідаецца пяць, то вызваляецца стаўка кіраўніка, галоўнага бухгалтара... Яшчэ існуе праблема накіравання ў жыллёва-эксплуатацыйныя службы людзей па дэкрэце №18 («Аб дадатковых мерах па дзяржаўнай абароне дзяцей у небяспечных сем'ях». — **Аўт.**). Найчасцей за ўсё «абавязаных асоб» накіроўваюць якраз у ЖЭСы. З аднаго боку, жыхары патрабуюць якасці выканання работ, з другога — у службу прыходзяць работнікі, якія не ведаюць, як мятлу ў руках трымаць, або не жадаюць прыбіраць чыста. Жыхароў дома тая праблема не цікавіць. Але гэта нашы рэаліі, якія трэба ўлічваць.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.
medvedeva@zviazda.by

ДАДАТКОВЫ НА БРЭСТ

У сувязі з ростам пасажырапатоку ў зносінах Брэст — Мінск — Брэст Беларуская чыгунка з 20 верасня прызначыла дадатковы поезд міжрэгіянальных ліній №656/655 Брэст — Мінск.

Састаў будзе курсіраваць па нядзелях да ўводу ў снежні новага графіка руху паяздоў на 2015-2016 гады. Са станцыі Брэст-Цэнтральны поезд будзе адпраўляцца ў 15.50 і прыбываць у Мінск у 19.56. Час адпраўлення ў зваротным кірунку са станцыі Мінск-Пасажырскі — 20.45. Праязныя дакументы на поезд ужо можна набыць у касах Беларускай чыгункі.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

Извещение о проведении ООО «Центр эксперт-услуг» (организатор аукциона) повторного открытого аукциона по продаже объектов недвижимого имущества 2-мя лотами

Лот 1:

Предмет аукциона: помещение бытового обслуживания населения с инвентарным номером 350/D-246560, общей площадью – 144,7 м кв., расположенное по адресу: г. Гомель, ул. 10 лет Октября, 1-2.

Начальная цена объекта аукциона – 477 757 440 бел. рублей с НДС.

Шаг аукциона – 5% от начальной стоимости объекта.

Задаток – 15 000 000 бел. рублей с НДС.

Земельный участок: 501/10000 доля в праве аренды на земельный участок площадью 0,5189 га сроком до 22.05.2033 г. Переход права на долю осуществляется в соответствии с действующим законодательством.

Лот 2:

Предмет аукциона: одноэтажное кирпичное здание диспетчерской (здание неустановленного назначения) с инвентарным номером 350/С-135708, общей площадью диспетчерской – 8,4 кв.м (составные части: кирпичная мастерская площадью застройки – 66 кв.м, металлические ворота), расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Комсомольская, 3а.

Начальная цена – 184 800 000 (сто восемьдесят четыре миллиона восемьсот тысяч) бел. рублей с НДС.

Шаг аукциона – 10% начальной стоимости объекта.

Задаток – 10 000 000 (десять миллионов) бел. рублей с НДС.

Земельный участок: площадь 0,0111 га, предоставлен на праве аренды сроком до 07.04.2019 г. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством.

Задаток перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет 3012403517013 в «Приорбанк» ОАО ЦБУ 400 г. Гомель, МФО 153001749, УНП 491058984, получатель платежа – ООО «Центр эксперт-услуг», назначение платежа: задаток для участия в аукционе по Лоту 1 или 2, согласно извещению в газете «Звязда» от 18.09.2015 г.

Перечень документов, необходимых для участия в аукционе, дополнительная информация об Объекте аукциона размещены на сайте **standard.by.**

Из задатка, внесенного участником аукциона, и ставшего победителем аукциона или единственным участником, который согласился приобрести Объект аукциона по начальной цене, увеличенной на 5% (далее – Победитель аукциона), Организатором аукциона удерживается вознаграждение за организацию и проведение аукциона в размере 3% от стоимости Объекта аукциона, сформированную по результатам аукциона.

Победитель аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней после подписания в день проведения аукциона протокола о результатах аукциона обязан заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта аукциона. Если между Продавцом и Победителем аукциона в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за объект, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после подписания договора купли-продажи.

Аукцион состоится 28 сентября 2015 г. в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Старочерниговская, 7а. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 24 сентября 2015 г. до 16.00 по указанному адресу.

Тел.: 8 0232 22 48 82, + 375 29 685 49 86.
E-mail: 6854986@standard.by.

Standard.by

АБАРАНІЦЬ ПАКУПНІКА...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Па словах намесніка галоўнага ўрача Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Вадзіма Гуліна, максімум для лабараторных даследаванняў — 24 дні. Згодна з пастановай №666, дзяржаўная санітарна-гігіенічная экспертыза праводзіцца па заяўным прынцыпе ў тэрмін да 15 дзён. Пры неабходнасці Міністэрствам аховы здароўя будуць прыцягнуты дадатковыя сілы і сродкі для правядзення дзяржаўнай санітарна-гігіенічнай экспертызы прадукцыі замежнай вытворчасці, але пакуль неабходнасці ў гэтым няма.

У агульным аб'ёме неадпаведнасцяў, выяўленых з пачатку года Міністэрствам аховы здароўя падчас праверак, 80 працэнтаў прыпадае на імпартныя тавары. «З пачатку года мы правялі пэўную колькасць выпрабаванняў розных груп тавараў. Прычым мы не рабілі акцэнт, што вось гэта — імпартны, а гэта — айчынны тавар. Магчыма, айчыннага тавару было нават больш. Але з усяго аб'ёму атрыманых неадпаведнасцяў 80 працэнтаў прыпала на імпарт», — адзначыў Ігар Гаеўскі.

Пералік імпартных тавараў, якія падлягаюць абавязковай санітарна-гігіенічнай экспертызе, з'яўляецца адкрытым. «Людзей, якія займаюцца імпартам тавараў і не трапілі ў гэты спіс, у спакоі не пакінем. У нас ёсць права займацца наглядам. І калі падчас яго будуць негатыўныя вынікі, значыць, мы дапоўнім пералік. Утойваць мы гэтага не будзем, уся інфармацыя з'явіцца на сайтах», — сказаў Ігар Гаеўскі. Пры гэтым ён не выключыў і зваротнага працэсу — скарачэння пераліку. Гэта адбудзецца ў тым выпадку, калі спецыялісты прыйдуць да высновы, што сітуацыя па пэўных групах тавараў спрыяльная, прадукцыя адпавядае ўсім патрабаванням. «Калі не праявіў сябе негатыўна, не стварыў праблем нашым грамадзянам, навошта ствараць дадатковы бар'ер такому тавару? Мы разгледзім і выкраслім гэты тавар са спіса, ён застанецца ў абарачэнні з тымі дакументамі, якія прадугледжаны тэхнічнымі рэгламентамі Мытнага саюза».

Са спіса імпартнай прадукцыі, якая падлягае дзяржаўнай санітарна-гігіенічнай экспертызе, выключаны канцылярскія прылады, а таксама бытавыя электрапрыборы, прызначаныя для кантакту з ежай, халадзільнікі, маразільнікі і мэбля. У Рэспубліканскім цэнтры гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя растлумачылі, што гэтае рашэнне прынята з улікам аналізу вынікаў дзяржаўнага санітарнага нагляду абгрунтаванняў, што паступаюць ад суб'ектаў гаспадарання, а таксама практыкі прымянення дакумента. Акрамя таго, удакладнена, што санітарна-гігіенічнай экспертызе падлягаюць матэрыялы, абсталяванне, прылады, якія прымяняюцца ў сферы гаспадарча-пітнога водазабеспячэння, прызначаныя для непасрэднага кантакту з пітной вадой (антыкаразійныя пакрыцці, іонаабменныя тканіны, смолы, фільтруючыя матэрыялы і прылады і інш.).

Сяргей СТАРЫНАЎ.

■ Будзь у курсе

«ГУСІНЫ» СЕЗОН

З трэцяй суботы верасня, якая сёлета прыпадае на 19-е чысло, у краіне распачнецца сезон паляванне на гусь белалобую, гуменніка, а таксама шэрую. Апроч таго, будзе дазволена здабываць канадскую казарку. Ва ўсіх выпадках гаворка ідзе пра птушак любога полу і ўзросту.

— Дазволена паляванне ў светлы час сутак зброевым спосабам з засады, з падыходу, з пад'езду на маламерных суднах, але без рухавіка ці з непрацуючым рухавіком, — распавёў «Звяздзе» **старшы дзяржаўны інспектар Мінскай абласной інспекцыі аховы жывёльнага і раслінага свету Вадзім ВАРАБЕЙ.** — Можна выкарыстоўваць гладкаствольную паляўнічую зброю і патроны са шротам. Сабак дазваляецца браць з сабой на паляванне ўсіх парод, акрамя ганчакоў і хартоў. Таксама можна здабываць птушыную дзічыну бяззброевым спосабам — з выкарыстаннем лоўчых птушак. Сезон палявання на гусь будзе доўжыцца па другую нядзелю снежня (па 13-е чысло).

Сяргей РАСОЛЬКА.
rs@zviazda.by

■ Неасабісты суб'ектыў

ПАЖЫЦЬ НА СВАІМ

Але спачатку трэба гэтае «сваё» пазнаць

На выхадных давялося выбіраць вазон для кветкі. Дакладней, не выбіраць — я ведала, што шукаю. А шукала я івянецкую кераміку. Не па цэтліках — па выглядзе. Сярод аднолькавых салодкапрыкрых кветачак, лісточкаў ды матылькоў кіслотных колераў, якія штампуюць замежныя вытворцы, наша, можна сказаць, штучны тавар. На самы патрабавальны густ, для тых, хто жадае, каб інтэр'ер быў арыгінальным ва ўсім, нават у гаршку для кветак. У мяне такіх стаіць ужо некалькі: з прылепленымі матузікамі, з малюнкамі няправільнай формы. Цяпер да іх «кампаніі» далучыўся яшчэ адзін — паласаты, нібы «зашпілены» на намаляваныя на ім гузікі. Хто прыходзіць у госці, дзівіцца не толькі адмысловым кветкам, але і посуду, у якім яны растуць. А я заўсёды кажу: «Гэта ж наша, беларускае».

Акрыленая ўдалай пакупкай, вырашыўшы падтрымаць айчыннага вытворцу яшчэ ў нечым, пайшла па радах з бытавой хіміяй. Выбар — найбагацейшы. Але дзе ж сваё? Тут жа па знешнім выглядзе не сарыентуешся, застаецца чытаць назвы. Калі б усе так проста! Акрамя вядомай усім «Мары», усе назвы на замежнай мове замежнымі літарамі. Краіна вытворчасці на цэтліках напісана дробна, вытворца на самім таварыі — яшчэ драбней. Але хто шукае, той не блудзіць. Вось, напрыклад, сродак для мыцця посуду «Sun day». Зроблены ў тых жа Асіповічах, што і «Мара», на той жа фабрыцы «Сонца». Вось апаласквальнік для бялізны «Soft silk» з водарам «луізіянская магнолія». Зроблены ў вёсцы Ліпнішкі Іўеўскага раёна. Вось яшчэ адзін сродак для посуду — «Clean tone», яго зрабілі ў Магілёве...

Дзеля чаго беларускія вытворцы робяць беларускія тавары «непазнавальнымі» — незразумела. Якасць — абсалютна нармальная, цана — часам удвая ніжэйшая, чым на аналагічныя імпартныя. Няўжо калі б тое мыла называлася «Сонейка», «Бляск», «Чысціня», «Ззянне», а апаласквальнік — «Аксаміт», «Пяшчота» (ды ці мала ў мове нашых, прыгожых, менавіта беларускіх слоў), людзі б меней куплялі? Думаю, наадварот, бо ў апошні час у многіх і ў нашай краіне, і ў блізкіх суседзяў (куды, уласна, найбольш і прадаём) слова «беларускае» стала сінонімам «якаснага». Чаго ж тады баімся? Як праводзіцца маркетынгавая палітыка? Бо, выбачайце, «мяккі шоўк» (па-англійску) ды яшчэ ў сукупнасці з «луізіянскай магноліяй» ну ніяк не стасуецца ні з Іўеўскім раёнам, ні з вёскай Ліпнішкі і асабіста ў мяне ніякіх іншых пачуццяў, чым жадання злосна пакпіць, не выклікае. (Хаця апаласквальнік даволі якасны, не горшы за імпартныя.)

Нехта запярэчыць: маўляў, некаторыя невялікія прадпрыемствы працуюць на імпартных складніках, з зарэгістраванымі гандлёвымі маркамі, якія абавязкова трэба згадваць. Але гэтыя прадпрыемствы — рэзідэнты Рэспублікі Беларусь і павінны працаваць у тым ліку і на краіну, якая дала ім такую магчымасць. І ніхто не забараняе напісаць назву той гандлёвай маркі драбней, а сваю, адметную — больш буйна. Не трэба ні дадатковых сродкаў, ні высілкаў. Проста падумаць. Калі не пра сваю краіну і сваё месца ў ёй, дык пра спажыўца і яго рэакцыю. І адпаведна пра рэалізацыю і прыбытак.

Бо спажывец не толькі шукае, каб танней і якасней, ён яшчэ і разважае. Нават пра назву сродку для чысткі сантэхнікі. І калі яму на ўсіх станцыях метро і па ўсіх тэлеканалах ды яшчэ выявай і вуснамі артысткі нацыянальнага тэатра паўтараць назву — «911» — ён урэшце задумаецца: «А навошта мне навязваюць тэлефонны нумар амерыканскай службы ратавання?» І яму ўжо няважна будзе, што сродак гэты выраблены ў родным Магілёве...

Што характэрна, вытворцы прадуктаў харчавання робяць з дакладнасцю да наадварот — выкарыстоўваюць калі не ўласна беларускія, дык славянскія назвы, кірылічныя шрыфты, якія падкрэсліваюць менавіта тутэйшае паходжанне прадуктаў. Горда зазначаюць гэтым: мы адказваем за тое, што робім, гарантуем якасць, ведаем, што па назве ў наступны раз вы будзеце шукаць менавіта нашу прадукцыю. Атрымліваецца, многія вытворцы тавараў нехарчовых да гэтага яшчэ «не дараслі»? Хаваюцца за тыповымі іншамоўнымі назвамі, якіх на паліцах — процьма, каб, калі што, не пазналі? А пазнаць жа хочацца адразу, каб, зразумеўшы, што сапраўды варта зараз «пажыць на сваім», не хадзіць у магазін з лупай, не адшукваць драбнюткае «Зроблена ў Беларусі».

Рыхтуючы гэты матэрыял, успомніла пра свае любімыя сукенкі. Купіла іх летась у краме, пашыты яны на нашых невялікіх прыватных фабрыках. На камплімэнты, якія абавязкова атрымліваю, калі адну ці другую апранаю, з гордасцю кажу: «Купляйце беларускае...» Сёння адчыніла шафу, паглядзела: так і ёсць! На адной на лэйбле напісана «Avers», на другой — «Vint»...

Сяджу, думаю, адчуваю сябе крыху самалётам. Спадзяюся, гэта пройдзе...

Алена ЛЯЎКОВІЧ. *alena@zviazda.by*

КІТАЙСКІ ВЕКТАР МАСТАЦКАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА

У гасцях у Выдавецкім доме «Звязда» пабывала намеснік дырэктара Рэспубліканскага інстытута кітаязнаўства імя Канфуцыя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта спадарыня Лю Сулін.

На сустрэчы, у якой з беларускага боку прынялі ўдзел дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Алесь Карлюкевіч і намеснік дырэктара — галоўны рэдактар часопіса «Нёман» Аляксей Чарота, абмяркоўваліся пытанні беларуска-кітайскага літаратурнага супрацоўніцтва. Спадарыню Лю Сулін праінфармавалі пра тыя выданні кітайскіх аўтараў, якія былі здзейснены ў Выдавецкім доме «Звязда» ў апошні час. А гэта — серыя з чатырох паэтычных зборнікаў «Светлыя знакі: паэты Кітая», анталогія кітайскай літаратуры XX стагоддзя на беларускай мове «Стагоддзе на знаёмства», а таксама аўтарская анталогія Міколы Мятліцкага, складзеная з перакладаў кітайскай паэзіі — «Пад крыламі Дракона. Сто паэтаў Кітая». Супольна з Рэспубліканскім інстытутам кітаязнаўства імя Канфуцыя БДУ «Звязда» выпусціла кнігу «Беларусь вачыма кітайцаў» і «кітайскі нумар» часопіса «Нёман», дзе прадстаўлена проза маладых пісьменнікаў Паднябеснай.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Спадарыня Лю СУЛІН — у гасцях у «Звязды».

Зараз у «Звяздзе» ідзе праца над зборнікам вершаў Лі Хэ. Укладальнік і аўтар большасці перакладаў — старшы выкладчык кафедры ўсходніх моў факультэта міжнародных адносін БДУ Алена Раманоўская. Работа па пераўвасабленні мастацкага свету славутага кітайскага паэта ідзе з арыгінала, з кітайскай мовы. Другая тэма, якая абмяркоўвалася падчас сустрэчы, — падрыхтоўка новага выпуску «Нёмана» з перакладамі сучаснай кітайскай прозы на рускую мову. Рэспубліканскі інстытут кітаязнаўства імя Канфуцыя БДУ становіцца надзейным партнёрам беларускага боку ў справе пашырэння беларуска-кітайскіх літаратурных сувязяў.

Сяргей ШЫЧКО.

КРЫХУ ПАХАЛАДАЕ, І ДАЖДЖЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

І ў нядзелю ўначы па паўднёва-ўсходняй палове, а ўдзень — на большай частцы краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах магчымы навальніцы, моцныя дажджы. Менавіта ў гэты дзень сапраўды пахаладае. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 7-14 градусаў, па паўднёвым усходзе будзе на пару градусаў цяплей, удзень чакаецца 15-22 цяпла. Аднак нават у нядзелю на поўдні ўдзень будзе даволі камфортна — плюс 23-27 градусаў.

Паводле папярэдніх і доўгатэрміновых прагнозаў, у першай палове наступнага тыдня надвор'е пачне паляпшацца. У панядзелак толькі месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 8-15 цяпла, удзень будзе плюс 15-22 градусы, па паўднёвым усходзе — да 25 цяпла. У аўторак у асобных раёнах пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай месцамі магчымы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 6-13 цяпла, удзень будзе плюс 17-24, а па паўднёвым усходзе — да плюс 27 градусаў.

Асобна сіноптыкі нагадалі, што на гэтым тыдні ў нашу краіну ненадоўга вярнулася лета. Цёплае надвор'е ўсталявалася ў другой палове тыдня, калі з паўднёвымі вятрамі да нас паступала вельмі цёплае паветра з Міжземнага мора. Тэмпературны фон павысіўся, і ўдзень максімальныя тэмпературы перавысілі плюс 20-27 градусаў, а ў асобных раёнах было нават плюс 30 градусаў. Спецыялісты падлічылі, што такі тэмпературны фон на 5-9 градусаў вышэйшы за кліматычную норму і больш характэрны для сярэдзіны жніўня.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки»,** г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703.
Продавец	**ОАО «Гомельдрев» (филиал «Паркетный завод»),** Минская обл., г. Смолевичи, ул. Торговая, 20, к. 47

Предмет аукциона

Наименование	Тип ТС	Регистрационный знак	Год выпуска	Двигатель (тип)
Транспортное средство Volkswagen Transporter	микроавтобус вагон	9483 ВС-5	1998	бензин, 2500 см³

Начальная цена с НДС 20% – 48 243 600 бел. руб.

Задаток 10% от начальной цены лота в белорусских рублях перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **10** (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также порядок оплаты вознаграждения и фактических затрат на организацию и проведение аукциона оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**

Дата и время проведения аукциона	**20.10.2015 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».**
Дата и время окончания приема документов	**19.10.2015 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».**
Контактная информация	**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. www.cpo.by E-mail: auction@cpo.by.**

ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

«ЖАМЧУЖЫНЫ» СІВІЦКАЙ ЗЯМЛІ

Праграма «Наперад у мінулае», якая выходзіць на тэлеканале «Беларусь 3», і ў новым тэлевізійным сезоне працягне радаваць прыхільнікаў і аматараў народнай творчасці

Нас чакаюць новыя знаёмствы з народнымі песнямі, танцамі і людзьмі, якія сёння жывуць у вёсцы. Падчас адной з паездак мы са здымачнай групай праграмы завіталі ў вёску Сівіца на Валожыншчыне. Знаёміліся з удзельніцамі фальклорнага гурта «Сівічанка».

— Калектыў быў заснаваны ў 1989 годзе. На працягу дзесяці гадоў кіравала ім Антаніна Сібач, і ў яго складзе было 12 чалавек. Людзі збіраліся разам, спявалі, танцавалі, прымалі ўдзел у розных святах Валожынскага раёна. Напрыклад, у 2013 годзе гурт «Сівічанка» выступаў на фальклорным свяце «Сваты» ў вёсцы Ракаў, — дзеліцца «біяграфіяй» калектыву яго цяперашні кіраўнік **Ірына ЛОЎЧАЯ.**

Жанчына ў сферы культуры працуе ўжо не адзін дзясятак гадоў. Зараз сумяшчае спевы з працай на пасадзе загадчыцы бібліятэкі і клуба. Удзельніц «Сівічанкі» называе «жамчужынкамі». Сярод іх не толькі мясцовыя жыхаркі, але і тыя, хто жыве ў суседніх Вуглах. Назіраючы, як рыхтуюцца да выступлення сівічанкі, нельга не заўважыць іх хвалявання і радасці. Песні тут можна пачуць на дзвюх мовах: беларускай і рускай. І яны пераважна пра каханне.

Ігар Адамовіч пераняў любоў да жыцця ў вёсцы ад прадзеда.

Згадваючы пра свае маладыя гады, жанчыны з «Сівічанкі» адзначаюць, што некалі людзі, хоць і не мелі грошай, але весяліцца ўмелі. Вячоркі ладзілі штодня. Па чарзе прымалі гасцей, прыдумлялі, як лепей правесці час. Калі быў музыкант, то без яго не абыходзіліся... Сёння ўжо многае змянілася. Моладзь не затрымліваецца ў вёсцы, бо з працай няпроста. Але на дыскатэку прыходзяць.

— Пра даўніну з імі размаўляем. Я заўсёды параўноўваю, што мы чакалі, пакуль хлопцы прыйдуць нас запрашаць на танцы. Танцавалі «кракавяк», «падэспань», «полечку», — кажа Ірына Лоўчая. — Цяпер па-іншаму ўсё. І песні зусім не ранейшыя, дзе слова кранала за душу... На вяселлях дома збіраліся і ўсім хапала месца, ніякіх кавярняў не трэба было. Пакідаючы бацькоўскую хату, маладыя плакалі, цяпер жа радуюцца. А праз нейкі час разыходзяцца...

Тут не паспрачаешся нават, бо насамрэч сёння па-рознаму ставяцца да стварэння сям'і. І не кожнаму шчасціць у жыцці сустрэць свайго адзінага і каханага. Мабыць, галоўнае — чакаць і верыць, бо жыць з нелюбімым — для любога сумная перспектыва... Вось як заканчваецца на Валожыншчыне папулярная народная песня «Туман ярам»:

А хто ж гэта калечка дастане,
Той са мною на ручнічак стане...

Адазваўся казак маладзенькі:

— А я ж тое калечка дастану,
Я й з табою на ручнічак стану.
— Бадай тое калечка прапала,
Я й з нялюбым на ручнічак стала.

Дарэчы, у Сівіцы мы пазнаёміліся з маладым хлопцам **Ігарам АДАМОВІЧАМ,** які жыве ў гэтай вёсцы і спрабуе развіваць сваю фермерскую гаспадарку. Герою нашаму толькі 25 гадоў, але яго не прываблівае перспектыва з'ехаць у горад. Больш па душы працаваць на зямлі. Сёння ў яго гаспадарцы ёсць авечкі, каровы, індыкі і нават пчолы. Раней Ігар працаваў у калгасе бухгалтарам, але з часам вырашыў усе сілы накіраваць на развіццё сваёй справы. Ён ведае, што значыць працаваць ад цямна да цямна, але гатовы ўкладаць час і грошы ў сваю задуму. Кажа, пры жаданні зарабіць на вёсцы заўсёды знойдзецца магчымасць для таго, хто не лянуецца працаваць (але сваіх уласных сакрэтаў не адкрывае).

— Калі паглядзець, то кожны ў нешта сваё ўкладае грошы. Хто дом рамантуе, хто яшчэ што робіць, а я ўсё — у гаспадарку. А з рамонтам часам і сябры могуць дапамагчы, калі пачаставаць іх шашлыком з бараніны, — усміхаецца хлопец.

Сваю любоў да вёскі і жаданне працаваць тут тлумачыць проста: «Мой дзед і прадзед па мамінай лініі былі такімі ж ахвочымі зарабляць уласнай працай». Пакуль што ў яго яшчэ ўсё ў вялікім «мінусе», але хлопец спадзяецца, што аднойчы праца дасць прыбытак...

Назва вёскі, як расказала яе жыхарка **Аліцыя ЗВЯРКО,** пайшла ад урочышча, якое знаходзіцца непадалёк у Налібоцкай пушчы. Ёсць гара Сівая, куды заўсёды ездзілі касіць сена. Успамінае жанчына, што жыццё было нялёгкім, але ў ім заўсёды было месца спевам. Дарэчы, у гэтай вёсцы нарадзіўся і пэўны час жыў бацька народнай артысткі Ядвігі Паплаўскай — Канстанцін Іосіфавіч, які зрабіў вялікі ўклад у развіццё беларускай народнай культуры. Кастусь нарадзіўся ў 1912 годзе ў сялянскай сям'і. Усё дзяцінства хлопчыка прайшло ў працы, і тады ж зарадзілася ў ім любоў да песні. З васьмі гадоў іграў на гармоніку, потым на скрыпцы, балалайцы. У навакаллі ён лічыўся найлепшым музыкантам... Ужо ў юнацтве ў хлопца праявіліся кампазітарскія здольнасці. Калі іх аценіў вядомы польскі піяніст Станіслаў Шпінальскі, то з'явілася магчымасць наведваць урокі скрыпкі і тэорыі музыкі ў Віленскай кансерваторыі. У 1937 годзе Паплаўскі бліскуча здае экзамены на факультэт капэльмайстраў пры кансерваторыі ў Катавіцах. Але падзеі Другой сусветнай руйнуюць планы атрымаць дыплом... Пасля вайны ён вяртаецца да любімай справы. Са сваіх землякоў стварае квартэт баяністаў, які стаў вядомы нават за межамі рэспублікі. Музычную адукацыю працягвае ў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі на дырыжорска-харавым і тэарэтычным факультэтах. У 1952 годзе разам з Генадзем Цітовічам стварае Беларускі дзяржаўны народны хор, дзе працаваў спачатку галоўным хормайстрам, а потым мастацкім кіраўніком. У залаты фонд беларускага песеннага мастацтва ўвайшлі апрацоўкі Канстанціна Паплаўскага таксама беларускіх народных песень, як «Ой, павей, буйны вецярочак», «Туман, туман пры даліне», «Закаці, закаці ты, ясна сонейка», «Кукавала зязюля ў садочку», «Цераз сад-вінаград» і многіх іншых. Апошняй яго працай быў вянок з дзесяці беларускіх народных танцаў, які ён зрабіў для кафедры харэаграфіі Мінскага інстытута культуры.

«Сівічанка» заўсёды гатова парадаваць добрай песняй.

Лідар гурта «Дразды» і вядучая Аксана Вечар абдумваюць наступны дубль.

На вяселлях дома збіраліся і ўсім хапала месца, ніякіх кавярняў не трэба было. Пакідаючы бацькоўскую хату, маладыя плакалі, цяпер жа радуюцца. А праз нейкі час разыходзяцца...

З гэтай мясцовасцю звязана таксама імя лідара гурта «Дразды» **Віталя КАРПАНАВА,** які ў той дзень далучыўся да нашай кампаніі падчас здымак. Аказваецца, менавіта яго калектыў будзе выбіраць песню з тых, што выконвалі сівічанкі. Адна атрымае новае гучанне і папоўніць рэпертуар «Драздоў». Пакуль мы чакаем аранжыроўшчыка, Віталь ладзіць нам экскурсію па родных мясцінах.

— Вось альтанка, дзе збіраліся некалі з кампаніяй. Я іграў свае песні, і мы нешта стваралі, — распавядае спявак. — Мая вуліца Маладзёжная. Калі пачаў зарабляць, то адрамантаваў дом. Думаю ў наступным годзе заняцца агароджай. Лазня ёсць, і на матацыкле можна пакатацца пры жаданні. Сюды сына прывожу да бабулі. А вось тут планую вырасціць алею з яблынь і вішняў.

Са з'яўленнем Максіма Осіпава, які цяпер з'яўляецца адным з аранжыроўшчыкаў праграмы «Наперад у мінулае», здымачная група пачынае абмяркоўваць далейшую працу, а я лаўлю сябе на думцы: у вёсцы жыццё зусім іншае, а людзі такія натуральныя і непаўторныя. Але час рушыць далей, каб знаёміцца з новымі старонкамі народнай творчасці!..

Алена ДРАПКО.

СА «ЗВЯЗДОЮ» — СПАДРУЧНЕЙ!

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на IV квартал або II паўгоддзе 2015 года, запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце
ДА 14 КАСТРЫЧНІКА 2015 ГОДА
ў рэдакцыю на адрас:
220013, г. Мінск, вул. Б.Хмяльніцкага, 10А.

ПРАЛЬНАЯ МАШЫНА LG

Сярод падпісчыкаў 15.10.2015 года будзе разыграна 7 прасаў Bosch і суперпрыз — пральная машына LG. Вынікі апублікуюць у газеце «Звязда» да 25.10.2015 г.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі па 31.12.2015 г. пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на IV квартал або II паўгоддзе 2015 г. і пашпарта.

Пасля 31 снежня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Са «Звяздою» — спадручней!» чытайце ў нумары 174 газеты «Звязда» ад 11.09.2015 г.

Тэлефон для даведак (017) 284 44 04.
ТЭРМІН ПРАВЯДЗЕННЯ ГУЛЬНІ — З 12.09.2015 ПА 31.12.2015.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 2619 ад 11.09.2015, выдадзена Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь

КАБ НЕ СУМАВАЦЬ У ЛІСТАПАДЗЕ

Спадзяёмся, што сярод штодзённых ураджайных клопатаў вы не забыліся, што ідзе падпіска на IV квартал. Наперадзе самыя самотныя доўгія вечары, а хто дапаможа іх правесці нясумна і цікава, як не любімая газета? Мы пастараемся, каб вам штодня было што пачытаць, абмеркаваць з блізкімі, над чым задумацца. Цёплая коўдра, гарачая гарбата і газета, якая не дае нудзіцца, — што яшчэ патрэбна ў ранніх прыцемках лістапада?

Заставайцеся з намі — будзе цікава!

2 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на IV квартал 2015 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

_____

Падпіска афармлена і аплачана ў _____
(аддзяленне сувязі)
_____ на IV кв. 2015 года

Хатні адрас і тэлефон _____ _____
(абавязкова) (індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

НЯЎРЫМСЛІВЫ НАЎРАД ЦІ АШЧАДЛІВЫ

Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» гульня «Размаўляем па-беларуску». Для таго, каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт http://tvrgomel.by або http://3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Ну а праверыць сваё веданне роднай мовы пасля таго, як праграма выйшла ў эфір, можна з дапамогай «Звязды». Ці ведалі вы, што:

Ві́тка — скручаны лазовы дубец, якім прымацоўваюць што-небудзь. *«На коллях плота віткі пагнілі», — пісаў Якуб Колас.*

Неспадзе́ўка — непрадбачаны выпадак, здарэнне. *«Прапанова выступіць для мяне была неспадзеўкай, і я збянтэжыўся», — чытаем у Рамана Сабаленкі.*

Ашча́длівы — эканомны, беражлівы. *У ашчадлівага гаспадара ніводнае зярнятка не прападзе.*

Ма́рмур — цвёрдая горная парода розных колераў. *Слова прыйшло з лацінскай мовы (marmor ад грэч. marmaros — бліскучы).*

Няўры́мслівы — непаседлівы, які не можа супакоіцца, суняцца. *Няўрымслівыя дзеці, няўрымслівыя хлапчукі, можа быць і характар няўрымслівы.*

Ата́ва — трава, што вырасла ў той жа год на месцы скошанай. Ёсць беларуская прыказка: проста атаву скасіць, ды не проста ў хлеў скласці.

Хоць патоп — нішто не хвалюе, не кранае, не мае значэння для каго-небудзь. Беларусы яшчэ скажуць — хоць трава не расці, і гора мала, ні горача ні халодна. Рускі — по барабану, до фонаря. Лічыцца, што выраз належыць французскаму каралю Людовіку XV, у часы праўлення якога ўся ўлада належала фаварыткам. І на пратэст народных мас разбэшчаны дэспат быццам адказаў: «Манархія пратрымаецца, пакуль мы жывыя, а пасля нас — хоць патоп».

Выскаляць зубы — смяяцца, насміхацца з каго-небудзь. Беларускі сінонім — прадаваць зубы, зубы грэць на сонцы, рускія — скалит зубы.

Чарговыя выпускі тэлевіктарыны глядзіце ў эфіры «Беларусь 3» раніцай кожную суботу.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
astashkevich@zviazda.by

ПЕШШУ З ХВАЛЯЙ ПАЗІТЫВУ

20 верасня пачынаецца ўнікальны дабрачынны пешы тур спевака Аляксандра Сухарава. Проста са студыі інфармацыйнага партнёра — радыё «Мінская хваля» (пачатак у 10.00) — ён накіруецца пешшу ў Фаніпаль, дзе вечарам адбудзецца яго першы канцэрт.

Дзень Сухараў ідзе па дарогах Міншчыны — вечарам канцэрт. Пасля Фаніпаля — Энергетык, Узда, Капыль, Бокшыцы і Салігорск. Шэсць выступаў за тыдзень, 200 кіламетраў беларускіх дарог. На працягу дня Аляксандр будзе сустракацца з жыхарамі навакольных населеных пунктаў і выходзіць у эфір «Мінскай хвалі». Сам Аляксандр кажа, што галоўная задача гэтага тура, для якога ён напісаў новыя песні і пераасэнсаваў свае старыя хіты, — падзякаваць людзям за працу і даць ім хвалю пазітыву.

Да ведама: Аляксандр Сухараў заснаваў групу «Экіўокі» ў канцы 1998 года і дагэтуль застаецца яе нязменным лідарам, ідэолагам і вакалістам. Дэбютны альбом быў прадстаўлены на «Славянскім базары 99», затым група становіцца «Адкрыццём года» на фестывалі «Рок-каранацыя». У 2014-м адбыўся вялікі сольны канцэрт Аляксандра Сухарава. З пачатку 2015 года ён прымае ўдзел у разнастайных праектах.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.
lazovskaya@zviazda.by

ПАНЯДЗЕЛАК, 21 ВЕРАСНЯ

БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.30 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 19.40, 23.10 Зона Х.
8.50 Слова Мітрапаліта Паўла на свята Нараджэння Найсвяцейшай Багародзіцы.
9.10 Галоўны эфір.
10.05 Клуб рэдактараў.
10.45, 20.00 Серыял «Бацька Мацвей».
11.00, 13.00, 16.00 90 секунд.
11.45, 0.00 Меладрама «Я цябе ніколі не забуду».
13.40, 15.50 Меладрама «Русалка». 1—2-я серыі.
15.15, 18.40 Навіны рэгіёна.
17.35 Беларуская часінка.
19.20 Арэна.
21.00 Панарама.
21.40 Серыял «След».
23.50 Дзень спорту.

БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Тэлераніца.
9.00, 10.00, 21.05 Тэлебарометр.
9.05 «Арол і рэшка. Шопінг». Стайл-шоу.
10.35 Анімацыйны фільм «Сцюарт Літл».
12.00 Азбука густу.
12.35 Навуковае шоу прафесара Адкрывашкіна.
13.10, 17.55 Дэтэктыў «Выпадковы сведка».
14.10 «Разбуральнікі міфаў».
15.15 Баявік «Турыст».
17.00 «Перазагрузка». Маладзёжнае ток-шоу.
19.05 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
21.10 «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
22.05 КЕНА.
22.10 Серыял «Косці».
23.05 Рэпарцёр.
23.50 Серыял «Як я сустрэў вашу маму».

БЕЛАРУСЬ 3

7.15 «Дабраранак».
7.45, 12.45, 15.20, 19.05, 0.25 «Калейдаскоп».
7.55, 15.30, 19.15, 0.35 «Размовы пра духоўнае».
8.05 «Сібірыяда». Кінараман. 1-я — 4-я часткі.
11.25 Хіт-парад «Сто песень для Беларусі».
12.20 «Наперад у мінулае».
12.55 «Пані Марыя». Драма.
14.20, 21.05 «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
14.50 Вандроўка з «Бяседай». Гомельская вобласць.
15.40 «Лэдзі і разбойнік». Меладрама.
17.10 «Справы фамільныя». «Хай будзе святло». Пра гісторыю беларускіх электрастанцый.
17.35 «Порах». Драма.
19.25 «Цені знікаюць апоўдні». Драма. 1-я серыя. «Чырвоная Мар'я».
20.45 «Калыханка».
21.35 «Забіць гаўляйтара». Дак. фільм.
22.20 «Гадзіннік спыніўся апоўначы». Драма.
0.00 «Дыя@блог». «Пра літаратуру».

БЕЛАРУСЬ 5

7.00, 7.35, 0.20 PRO спорт. Навіны.
7.15 Спорт-мікс.
7.50 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. БАТЭ (Барысаў) — «Тарпеда-БелАЗ» (Жодзіна).
9.40 Авертайм.
10.10 Хакей. КХЛ. ХК «Сочы» — «Дынама» (Мінск).
12.05 Фрыстайл. Адкрыты чэмпіянат Беларусі па скачках на лыжах у ваду. Фіналы.
13.20 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Саўтгэмптан» — «Манчэстэр Юнайтэд».
15.15 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
15.45 Пляжны валейбол. Турнір серыі Мастэрс. Матч за 3-е месца.
16.50 Пляжны валейбол. Турнір серыі Мастэрс. Фінал.
17.55 Гандбол. SEHA-ліга. БГК імя Мяшкова (Беларусь) — «Вайводзіна» (Сербія).
19.35 Хакей. Кубак Беларусі. Паўфінал. Першы матч. «Юнацтва» (Мінск) — «Шахцёр» (Салігорск).
21.50 Час футбола.
22.30 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
23.25 Еўрапейскі покерны тур.

АНТ

6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 Контуры.
10.00 «Жыць здорава!»
11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00 Навіны спорту.
11.10 «Фазэнда».
11.55 «Модны прыгавор».
13.10 «Мужчынскае/Жаночае».
14.10 «Сам-насам з усімі».
15.05, 16.20 «Час пакажа».
16.50 «Давай пажэнімся!»
18.20 «Адваротны адлік».» Халодная вайна Леаніда Рубінштэйна».
18.55 «Чакай мяне».
20.00 Час.
21.05 «Справа прынцыпу».
22.15 Канцэрт Сасо Паўліяшвілі.
0.45 Начныя навіны.

СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.25 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
8.30 «Тыдзень».
9.25 «Вялікае снеданне».
10.05 «Далёкія сваякі».
10.40 «Салдаты 10». Серыял.
11.35 «Сямейныя драмы».
12.30 «Не хлусі мне!»
13.50 «Ежа багоў».
14.45 «Такі лёс».
15.30 «Дарагая перадача».
15.55 «Іншая краіна». «Грузінскі акцэнт».
16.50 «Вялікі горад».
17.35 «Званая вячэра».
18.35 «Самыя шакавальныя гіпотэзы»: «З чаго зроблена мяса».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 «Ваенная тайна».
23.00 «Тыдзень спорту».
23.30 Маст. фільм «Доля анёлаў».
1.10 «Дакументальны праект»: «Усім смерцям на злосць».

МІР

6.00 «180 хвілін».
9.00 «Беларусь сёння».
9.30 «Любімыя акцёры».
10.00 Маст. фільм «Дзеці Дон-Кіхота».
11.25 Маст. фільм «Мы з джаза».
13.00, 16.00, 19.00, 22.05, 23.10 Навіны (бягучы радок).
13.20, 3.05 Дак. серыял «Давайце разбярэмся!».
14.15, 3.55 Серыял «Мужчына ўва мне».
16.20, 5.30 Дак. серыял «Іншы свет».
16.50 Дак. серыял «Зямля. Тэрыторыя загадак».
17.20 Серыял «Маўклівы сведка».
19.25 Серыял «Востраў непатрэбных людзей».
22.15 Ток-шоу «Слова за слова».
23.25 Маст. фільм «Сёмы пялёстак».
1.20 Маст. фільм «Сэрцы чатырох».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Раніца Расіі».
10.00 «Карціна свету».
10.55 Надвор'е на тыдзень.
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.35 Ток-шоу «Што адбываецца».
12.35 «Пакой смеху».
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.30 «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
15.30 «Прамы эфір».
17.30 Серыял «Тайны следства».
19.10, 20.55 Серыял «Скліфасоўскі».
22.00, 23.10 Серыял «Непрыдуманае жыццё».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.00 «НТБ раніцай».
7.10, 8.05 Серыял «Ляснік».
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
9.05 «Раніца з Юліяй Высоцкай».
10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара. Новыя серыі».
12.00 «Суд прысяжных».
13.15 «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
14.20 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
14.40 «Ядзім дома».
15.10 «Лаліта».
16.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».
17.55 «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
19.40 Серыял «Шэф. Новае жыццё».
23.00 «Анатомія дня».
23.40 Серыял «Знакі лёсу-3».

8 КАНАЛ

7.00, 14.05, 19.45, 21.05, 23.25 «Надвор'е».
7.05, 16.00 Мультпарад.
7.25, 19.50 Серыял «Горад мары».
8.20 Драма «Прывід».
10.30, 18.10 «Аналітычная праграма».
10.40 Трылер «30 дзён ночы».
12.35 «Кінаблакнот».
12.45, 13.50, 15.45, 16.30, 18.20, 19.30, 21.00 «Хатняя крама».
13.00 Серыял «Флэш».
14.10 Серыял «Лавізна».
16.10 «Золата маўчання».
16.40 Серыял «Апошні карабель».
18.25 Серыял «Сутыкненне светаў».
20.50 «Вечарніца».
21.10 Драма «Праклён залатой кветкі».
23.10 Серыял «Даведнік па сямейным жыцці».
23.30 «Хобі + TV».

ВТВ

6.00 «PLAY».
7.00 М/ф «Смяшарыкі».
7.30, 14.30, 4.00 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
8.00, 17.30, 0.00 Скетч-шоу «6 кадраў».
8.30 Серыял «Вароніны».
9.00 «Паспець за 24 гадзіны».
10.00, 19.00 Серыял «Месяц».
11.00 Прыгоды «Мушкецёр».
13.10 «Ералаш».
13.30, 20.00 Серыял «Апошні з Магікян».
15.00, 3.00 Рэаліці-шоу «Ты нам падыходзіш».
16.00 Серыял «Навіны».
17.00, 4.30 «Лаві момант».
18.00, 23.30 Серыял «Анжаліка».
19.00 Серыял «Месяц».
21.10 Камедыя «Укол парасонам».
0.30, 5.30 «Дурні і дарогі».
1.00 Серыял «90210: новае пакаленне».
5.00 Скетч-шоу «Даеш моладзь».

КУЛЬТУРА

7.00 «Еўраньюс».
10.00, 15.00, 19.30, 0.00 Навіны культуры.
10.15, 1.40 «Назіральнік».
11.15 «Містэр Ікс». Маст. фільм.
12.50 «Лета Гасподняе». Нараджэнне Прасвятой Багародзіцы.
13.15 «Гай Юлій Цэзар». Дак. фільм.
13.25, 15.10 «Белы Бім Чорнае вуха». Маст. фільм.
16.35 «80 гадоў Уладзіміру Кастрову. «Эпізоды».
17.20 «Шарль Кулон». Дак. фільм.
17.30 XV Міжнародны конкурс імя П.І. Чайкоўскага. Лаўрэаты і прызёры. Фартэпіяна.
18.45 Да 100-годдзя з дня нараджэння Сяргея Смірнова. «Апавяданні пра герояў. Вольга Янько».
19.15 «Добрай ночы, малыя!»
19.45 Галоўная роля.
20.00 «Саці. Нясумная класіка...»
20.40 «Правілы жыцця».
21.10 Да юбілею Людмілы Максакавай. «Урокі майстэрства». Дак. серыял. Фільм 1-ы.
21.35 «Тым часам».
22.20 «Сага пра Фарсайтаў». Серыял.
23.15 «Кінескоп». 72-і Венецыянскі міжнародны кінафестываль.
0.15 Мастсавет.
0.20 «Пётр Першы. Завяшчанне». Серыял. 1-я серыя.
1.15 «Архіўныя тайны». Дак. серыял.
2.40 «Сусветныя скарбы культуры».

НАСТАЛЬГІЯ

6.00, 0.00 «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1978. Паўтор ад 2008 года.
7.00, 8.45, 11.25, 12.40, 14.25, 14.55, 17.10, 18.55, 20.20, 21.40, 23.00, 1.00, 2.35, 3.40, 5.00 Музычная настальгія.
7.20 Дак. фільм «Вельмі вас усіх люблю».
9.00 «Быў час». 2009 год.
10.00 Маст. фільм «Гракі».
12.00 «Акулы пяра». Васіль Шумаў. 1995 год.
13.20 Дак. фільм «Яўген Габрыловіч».
14.50 М/ф «Савушкін, які не верыў у цуды».
16.00 Маст. фільм «Ехалі мы, ехалі...»
18.00 «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Майк Навуменка». 2005 год.
19.20 Маст. фільм «Зазуля з дыпломам».
20.50 М/ф «Казка пра добрага насарога».
21.00, 3.00 «Мінулы час».
22.00 «Народжаныя ў СССР».
1.15 Маст. фільм «Пароль ведалі двое».
2.50 М/ф «Што на што падобна».
4.00 «Колба часу».

EUROSPORT

4.00, 10.00, 21.45 WATTS!
4.30, 10.45, 20.15 Снукер. Шанхай Мастэрс. Фінал.
6.30, 8.30, 12.45 Футбол. Чэмпіянат MLS.
9.25, 0.10 Спорт знутры.
9.30 Стральба з лука. Кубак свету.
10.30 Аўтаспорт па выхадных.
15.00, 2.30 Тэніс. ATP Tour. St. Petersburg Open.
19.00, 23.00 Футбол. Еўрагалы.
22.00 Веласпорт. Мемарыял Марка Пантані.
0.15 Конны спорт. Клуб конніка.
0.30 Конны спорт. Чэмпіянат свету па канкуры сярод маладых коней.
1.30 Вяслярны слалам. Чэмпіянат свету.

КАМЕДЫЯ

6.00, 10.00, 17.45, 3.10 Серыял «Шчаслівыя ў разводзе».
6.40 Камедыя «Матулі».
8.10 Камедыя «Любовь-морковь».
10.45 Камедыя «Здзелка».



12.25 Камедыя «Правадыр разнаскурых».
14.00, 14.45, 15.25 «Камедыянты (Шоу)».
14.25, 15.10, 20.00, 22.50,0.55, 2.55 Скетчком «Паміж намі».
16.00 Меладрама «Купі, пазыч, украдзі».
18.30 Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе».
20.20 Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе 2».
22.00 Серыял «Кёрсці». 1-2 серыі.
23.10 Камедыя «Каханне ад усіх хвароб».
1.15 Камедыя «Дзіўныя сваякі».
4.00 Камедыя «Блізнюк».

ТБ3

6.00 М/ф.
7.55 «Доктар І...».
8.25, 19.00, 1.15 «Забароненае каханне». Серыял.
9.55, 3.30 «Судовыя страсці». Дак. серыял.
10.45, 4.20 «Па справах няпоўнагадовых». Дак. серыял.
11.40 «Справа Астахава». Дак. серыял.
12.35 «Сакрэты экстрасэнсаў». Дак. серыял.
13.30 Меладрама «Лёс Мары».
15.15 «Нераскрытыя тайны».
16.10 «Шчырая гутарка».
17.10 «Пра што маўчала Ванга». Дак. фільм.
18.00 «Тайны следства». Серыял.
20.45, 0.30 «Дарога на востраў Пасхі». Серыял.
21.45 «Мар'ін гай». Серыял.
22.45 «Зорныя гісторыі».
23.40 «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
2.35 «Часова даступны».

ТБ1000

6.00 М/ф «Воблачна, магчымы ападкі ў выглядзе фрыкадэлек».
8.00 Меладрама «Святло вакол».
10.00 Драма «Джулі і Джулія: гатуем шчасце па рэцэпце».
12.10 Меладрама «Пакладзіся на сяброў».
14.00 Драма «Марыя-Антуанета».
16.10 Драма «Усмешка Моны Лізы».
18.10 Меладрама «Шоўк».
20.00, 4.15 Фантастыка «Дзіця чалавечае».
21.45 Прыгоды «Кінг Конг».
1.00 Камедыя «Справа ў табе».
2.30 Баявік «Быць Флінам».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.20 Трагікамедыя «Адзінокая жанчына жадае пазнаёміцца».
8.00 Драма «Гульні матылькоў».
9.50 Драма «Сава Марозаў».
13.20 Фантастыка «Цяжка быць богам».
15.35 Драма «Клас карэкцыі».
17.10 Драма «Дыялогі».
18.50 Драма «Адна вайна».
20.20 Драма «Нябесны суд».
22.00 Драма «Нябесны суд. Працяг».
1.20 Камедыя «Механічная сюіта».
3.00 Меладрама «Ваенна-палявы раман».
4.30 Драма «Чыстая перамога».

NATIONAL GEOGRAPHIC

6.00, 8.05, 11.50 Гульні розуму.
7.15 Навуковыя недарэчнасці.
7.40 Зрабі або памры.
8.40 Узлом сістэмы.
9.20, 13.30, 19.20 2000-я. Найвялікшыя трагедыі.
10.10, 14.20, 20.10 90-я. Найвялікшыя футбольныя моманты.
11.00 Мегазаводы.
12.40 Шаша праз пекла.
15.10 Лёс белага мядзведзя.
16.00 Экстрэмальнае падарожжа.
16.50 Землетрасенне на Эверэсце.
17.40, 21.50, 2.00, 5.15 Дзікае надвор'е.
18.30 Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
21.00, 1.10, 4.30 Цунамі: дзень, калі ўдарыла хваля.
22.40, 2.50 80-я. Найвялікшыя трагедыі.
23.30, 3.40 Расследаванні авіякатастроф.
0.20 Эвакуацыя Зямлі.

DISCOVERY

8.00, 10.55, 15.55, 21.20 Як гэта зроблена?
8.25, 10.30, 15.30, 21.45 Як гэта ўстроена?
8.50, 11.20 Элементы.
9.40, 13.50 У пагоні за класікай.
12.10, 18.00 Паляўнічыя на склады.
13.00, 1.00, 7.10 Ванны пакой пад ключ.
14.40, 6.25 Портэр-Рыдж.
16.20, 5.40 Хуткія і гучныя.
17.10, 3.00 Махінатары.
18.50 Праз магію да зорак.
19.40 І зноў не спрабуйце паўтарыць.
20.30 Інжынерныя пралікі.
22.10 Уцячы ад пагоні.
23.00 У пошуках скарбаў.
0.00 Рачныя монстры.
2.00 Top Gear.
4.00 Маланкавыя катастрофы.
4.25 Сапраўдныя аферысты.
4.50 Паляўнічыя на рэліквіі.

АЎТОРАК, 22 ВЕРАСНЯ

БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.05 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 23.30 Зона Х.
9.10, 22.00 Серыял «След».
10.00, 13.00, 16.00 90 секунд.
11.05, 20.00 Серыял «Бацька Мацвей».
12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-5».
13.10 Дзень у вялікім горадзе.
14.05 Серыял «Дзявочае паляванне».
15.15, 18.40 Навіны рэгіёна.
15.25, 0.40 Серыял «Адшпіліце рамяні».
17.35 Беларуская часінка.
18.40 Навіны рэгіёна.
19.30 Выступленні кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь.
21.00 Панарама.
21.40 Спецыяльны рэпартаж.
23.50 Сфера інтарэсаў.
0.25 Дзень спорту.

БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Тэлераніца.
9.00, 21.05 Тэлебарометр.
9.05, 16.00 «Арол і рэшка. На краі свету». Трэвел-шоу.
10.00, 21.10 «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
11.00 «Зразумець і абясшкодзіць».
11.35 Беларуская кухня.
12.20, 17.55 Дэтэктыў «Выпадковы сведка».

13.20, 22.10 Серыял «Косці».
14.15, 19.05 Серыял «Не наражайся прыгожай».
17.00, 23.05 «Пін-код».
22.05 Спортлато 6 з 49, КЕНА.
23.55 Серыял «Як я сустрэў вашу маму».

БЕЛАРУСЬ 3

7.20 «Дабраранак».
7.50, 10.45, 14.15, 19.20, 1.10 «Калейдаскоп».
8.00 «Цені знікаюць апоўдні». Драма. «Чырвоная Мар'я».
9.20, 18.25 «Жазэф Бальзамо». Драма. 1-я серыя.
10.15, 0.15 «Святло далёкай зоркі». Памяці скульптара і мастака Лазара Рана.
10.55 «Зімовая раніца». Драма.
12.20 М/ф.
12.35 «Гадзіннік спыніўся апоўначы». Драма.
14.25, 21.30 «Вайна і мір». Драма. 1-я серыя «Андрэй Балконскі».
16.50 «Тварам да сцяны». Дэтэктыў.
19.30 «Цені знікаюць апоўдні». Драма. «Прышлыя людзі».
20.45 «Калыханка».
21.05 «Дыя@блог». «Пра літаратуру».
23.50 «Дыя@блог». «Пра мову».
0.45 «У гасцях у Барыса Аверына». Леанід Мазгавой, акцёр тэатра і кіно, заслужаны артыст Расіі.

БЕЛАРУСЬ 5

7.15, 7.45, 0.40 PRO спорт. Навіны.
7.30 Спорт-мікс.
8.05 Час футбола.
8.45 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
9.35 Хакей. Кубак Беларусі. Паўфінал. Першы матч. «Юнацтва» (Мінск) — «Шахцёр» (Салігорск).
11.25, 22.20 Гандбол. SEHA-ліга. БГК імя Мяшкова (Беларусь) — «Вайводзіна» (Сербія).
12.55 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Чэлсі» — «Арсенал».
14.45 Хакей. КХЛ. «Лакаматыў» (Яраслаўль) — «Дынама» (Мінск).
16.35 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Манчэстэр Сіці» — «Вест Хэм».
18.25 Спорт-кадр.
18.55 Міні-футбол. Кваліфікацыйны турнір ЧЕ-2016. Плэй оф. Матч у адказ. Беларусь — Чэхія.
20.25 Хакей. Ліга чэмпіёнаў. 1/16 фіналу. Першы матч. Фер'естад (Швецыя) — «Лулу» (Швецыя).
23.45 Еўрапейскі покерны тур.

АНТ

6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 «Жыць здорава!»
10.25 «Кантрольная закупка».
11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00 Навіны спорту.
11.10 «Фазэнда».
11.55 «Модны прыгавор».
13.10 «Мужчынскае/Жаночае».
14.10 «Сам-насам з усімі».
15.05, 16.20 «Час пакажа».
16.50 «Давай пажэнімся!»
18.20 Серыял «Татавы дочкі».
18.50 «Няхай гавораць».
20.00 Час.
21.05 Серыял «Джуна».
23.05 Баявік «Ліквідатар».
0.45 Начныя навіны.

СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.25 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
8.30 Баявік «Смяротная зброя».
10.40 «Салдаты 10». Серыял.
11.35 «Сямейныя драмы».
12.30 «Не хлусі мне!»
13.50 «Наша справа».
14.05 «Ежа багоў».
14.45, 23.45 «Водбліскі». Серыял.
16.50 «Цэнтральны рэгіён».
17.35 «Званая вячэра».
18.35 «Дакументальны праект»: «Сусвет».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 «Тэрыторыя памылак».
22.05 «Глядзець усім!»
23.00 «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
23.20 «Аўтапанарама».
1.25 «Дакументальны праект»: «Сусвет на далоні».

МІР

6.00 «180 хвілін».
9.00 «Агульны інтарэс».
9.30, 1.20 Маст. фільм «А Вы любілі калі-небудзь?»
11.10 Маст. фільм «Сёмы пялёстак».
13.00, 16.00, 19.00, 22.05, 23.10 Навіны (бягучы радок).
13.20, 3.00 Дак. серыял «Давайце разбярэмся!».
14.15 Серыял «Мужчына ўва мне».
16.20, 5.30 Дак. серыял «Іншы свет».
16.50 Дак. серыял «Зямля. Тэрыторыя загадак».
17.20 Серыял «Маўклівы сведка».
19.25 Серыял «Вострай непатрэбных людзей».
22.15 Ток-шоу «Слова за слова».
23.25 Маст. фільм «Дом, мілы дом».
3.50 Маст. фільм «Сэрцы чатырох».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Раніца Расіі».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.35 «Уся Расія».
12.30 Камедыя «Сабака на сене». 1-я серыя.
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.30 «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
15.30 «Прамы эфір».
17.30 Серыял «Тайны следства».
19.10, 20.55 Серыял «Скліфасоўскі».
22.00, 23.10 Серыял «Непрыдуманае жыццё».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.00 «НТБ раніцай».
7.10, 8.05 Серыял «Ляснік».
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
9.05 «Раніца з Юліяй Высоцкай».
10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара. Новыя серыі».
12.00 «Суд прысяжных».
13.15 «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
14.20 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
14.40 «Справа густу».
15.10 «Лаліта».
16.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».
17.55 «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
19.40 Серыял «Шэф. Новае жыццё».
23.00 «Анатомія дня».
23.40 Серыял «Знакі лёсу-3».

8 КАНАЛ

7.00, 14.05, 19.45, 21.00, 23.25 «Надвор'е».
7.05, 16.00 Мультпарад.
7.30, 19.50 Серыял «Горад мары».
8.30, 18.30 Серыял «Сутыкненне светаў».
9.35, 12.55, 13.50, 15.45, 16.50, 18.25, 19.30, 20.55 «Хатняя крама».
9.45 Дак. фільм.
10.15, 23.30 «Хобі + TV». Рэаліці-шоу «Свой фермер».
11.15 Камедыя «Стралец непрыкаяны».
13.00 Серыял «Флэш».
14.10 Серыял «Лавізна».
16.30 «Золата маўчання».
17.00 Серыял «Апошні карабель».
20.45 «Вечарніца».
21.05 «Даведнік па краінах і кантынентах».
21.15 Меладрама «Жалезная лэдзі».
23.05 Серыял «Даведнік па сямейным жыцці».

ВТВ

6.00 «PLAY».
7.00 М/ф «Смяшарыкі».
7.30, 14.30, 4.00 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
8.00, 17.30, 0.00 Скетч-шоу «6 кадраў».
8.30 Серыял «Вароніны».
9.00, 18.00, 23.30 Серыял «Анжаліка».
10.00, 19.00 Серыял «Месяц».
11.00 Камедыя «Укол парасонам».
13.15 «Ералаш».
13.30, 20.00 Серыял «Апошні з Магікян».
15.00, 3.00 Рэаліці-шоу «Ты нам падыходзіш».
16.00 Серыял «Навіны».
17.00, 4.30 «Лаві момант».
21.10 Камедыя «Прыгажуня».
23.05, 5.00 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
0.30, 5.30 «Дурні і дарогі».
1.00 Серыял «90210: Новае пакаленне».

КУЛЬТУРА

6.30 «Ёўраньюс».
10.00, 15.00, 19.30, 23.45 Навіны культуры.
10.15, 1.55 «Назіральнік».
11.15, 22.20 «Сага пра Фарсайтаў». Серыял.
12.10 «Сусветныя скарбы культуры».
12.25, 20.40 «Правілы жыцця».
12.50 «Эрмітаж».
13.20, 1.05 «Уладзімір Бортка. Не падводзячы вынікі...» Дак. фільм.
14.00, 0.05 «Пётр Першы. Завяшчанне». Серыял.
15.10 «Жывеш у такім клімаце». Фільм 1-шы.
15.40 «90 гадоў Вячаславу Броўкіну. Тэлетэатр Класіка.
16.40 «Кінескоп». 72-гі Венецыянскі міжнародны кінафестываль.
17.20, 1.50 «Васка да Гама». Дак. фільм.
17.30 XV Міжнародны конкурс імя П.І. Чайкоўскага. Лаўрэаты і прызёры. Фартэпіяна.
18.45 Да 100-годдзя з дня нараджэння Сяргея Смірнова. «Апавяданні пра герояў. Мікалай Усцінаў».
19.15 «Добрай ночы, малыя!»
19.45 Галоўная роля.
20.00 Штучны адбор.
21.10 «Людміла Максакава. Урокі майстэрства». Дак. серыял.
21.35 «Гульня ў бісер». «Барыс Слуцкі. Лірыка».
23.15 «Архіўныя тайны». Дак. серыял.
0.00 Мастсавет.

НАСТАЛЬГІЯ

6.00 «Акулы пяра». Васіль Шумаў. 1995 год.
6.40, 8.25, 8.55, 11.10, 12.55, 14.20, 15.40, 17.00, 18.50, 20.30, 21.40, 23.25, 1.00, 2.45, 5.25 Музычная настальгія.
7.20 Дак. фільм «Яўген Габрыловіч».
8.50 М/ф «Савушкін, які не верыў у цуды».
10.00 Маст. фільм «Ехалі мы, ехалі...».
12.00 «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Майк Навуменка». 2005 год.
13.20 Маст. фільм «Зазуля з дыпломам».
14.50 М/ф «Казка пра добрага насарога».
15.00, 21.00 «Мінулы час».
16.00, 22.00 «Народжаныя ў СССР».
18.00 «Спяем, сябры!» з Тацянай Візбар. Юрый Гарын. 2007 год.
19.20 Маст. фільм «Ноч кароткая».
20.45 М/ф «Самы галоўны верабей».
23.00 «Гэта было нядаўна, гэта было даўно... Тэлевізійныя мемуары». Яфім Шыфрын.
00.00 «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1978. 2-я частка. Паўтор ад 2008 года.
1.20 Дак. фільм «Вельмі вас усіх люблю».
3.00 «Быў час». 2009 год.
4.00 Маст. фільм «Гракі».

EUROSPORT

4.00 Футбол. Чэмпіянат MLS.
7.00, 21.15 WATTS!
7.30, 11.15, 2.30 Тэніс. ATP Tour. St. Petersburg Open.
9.30 Скачкі з трампліна. Летні Гран-Пры.
11.00 Конны спорт. Клуб коннікаў.
20.00 Футбол. Еўрагалы.
21.30, 22.45, 2.00 Супербайк. Чэмпіянат свету.
22.15 Суперспорт. Чэмпіянат свету.
23.30 Аўтагонкі. Чэмпіянат свету па эндуранс.
0.00 Мотакрос. Чэмпіянат свету.
0.30 Аўтагонкі. Серыя Бланкпэйн эндуранс.
1.30 Мотаспорт. Піт-стоп.

КАМЕДЫЯ

6.00, 10.00, 3.10 Серыял «Шчаслівыя ў разводзе».
6.45 Камедыя «Любовь-морковь».
8.35 Камедыя «Правадыр разнаскурых».
10.45 Меладрама «Купі, пазыч, украдзі».
12.30 Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе».
14.00, 14.45, 15.25 «Камедыянты (Шоу)».
14.25, 15.10, 20.00, 21.45,0.55, 2.55, 5.25 Скетчком «Паміж намі».
16.00 Камедыя «Каханне ад усіх хвароб».

17.50, 22.00 Серыял «Кёрсці».
18.35 Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе 2».
20.20 Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе 3».
23.10 Камедыя «Замуж на 2 дні».
1.15 Камедыя «Здзелка».
4.00 Камедыя «Дзіўныя сваякі».

ТБ3

6.00 М/ф.
7.50 «Доктар І...».
8.20, 19.05, 1.15 «Забароненае каханне». Серыял.
9.45, 3.05 «Судовыя страсці». Дак. серыял.
10.35, 3.50 «Па справах няпоўнагадовых». Дак. серыял.
11.30 «Справа Астахава». Дак. серыял.
12.20 «Сакрэты экстрасэнсаў». Дак. серыял.
13.15, 18.05 «Тайны следства». Серыял.
14.10, 2.40 «Простыя складанасці».
14.40, 22.50 «Зорныя гісторыі».
15.35, 5.30 «Нераскрытыя таямніцы».
16.10 «Шчырая гутарка».
17.05, 21.50 «Мар'ін гай». Серыял.
20.50, 0.30 «Дарога на вострай Пасхі». Серыял.
23.45 «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

ТБ1000

6.00 Драма «Усмешка Моны Лізы».
8.00 Меладрама «Пакладзіся на сяброў».
10.00 Меладрама «Шоўк».
12.00, 23.30 Камедыя «Квартэт».
13.35 Драма «Шляхі і путы».
15.20 Драма «Абяцанне».
17.00 Меладрама «Справа ў табе».
18.25 Драма «Філамена».
20.00 Драма «Развітальны квартэт».
21.45 Баявік «Быць Флінам».
1.20 Баявік «Планкет і Маклейн».
3.10 Меладрама «Іспанская-англійская».

РУССКОЕ КИНО ТВ 1000 — ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.20 Баявік «Асабісты нумар».
8.20, 13.20 Фантастыка «Паляўнічы».
12.00 Драма «Чорная курыца, або Падземныя жыхары».
17.00 Меладрама «Маша і мора».
18.40 Камедыя «Заяц над бездань».
20.20 Камедыя «Скарбы О.К».
22.20 Камедыя «Дванаццаць месяцаў».
0.05 Трылер «Стальны матылёк».
2.00 Драма «Мой сябар Іван Лапшын».
3.50 Фантастыка «Цяжка быць богам».

NATIONAL GEOGRAPHIC

6.00, 8.05, 11.50 Гульні розуму.
7.15, 16.50, 21.00, 1.10, 4.30 Навуковыя недарэчнасці.
8.40 Узлом сістэмы.
9.20, 13.30, 19.20 Цунамі: дзень, калі ўдарыла хваля.
10.10, 14.20, 20.10 Дзікае надвор'е.
11.00 Мегазаводы.
12.40 Шаша праз пекла.
15.10 Тайнае жыццё драпежнікаў.
16.00 Экстрэмальнае падарожжа.
17.40 Папулярная навука.
18.30 Супердабудаванні Трэцяга рэйха.
21.50, 2.00, 5.15 Чалавек супраць YouTube.
22.40, 2.50 90-я: дзесяцігоддзе, якое нас аб'яднала.
23.30, 3.40 Расследаванні авіякатастроф.
0.20 Эвакуацыя Зямлі.

DISCOVERY

8.00, 10.55, 15.55, 21.20 Як гэта зроблена?
8.25, 10.30, 15.30, 21.45 Як гэта ўстроена?
8.50, 11.20 Портэр-Рыдж.
9.40, 13.50 Хуткія і гучныя.
12.10, 18.00 Паляўнічыя на рэліквіі.
13.00, 7.10 Рыбацкія легенды Якуба Вагнера.
14.40, 6.25 Што было далей?
16.20, 5.40 Калекцыянеры аўто.
17.10, 3.00 Махінатары.
18.50 Рачныя монстры.
19.40 У пошуках скарбаў.
20.30 Уцячы ад пагоні.
22.10 Ідрыс Эльба: без тармазоў.
23.00 Мотарэстаўрацыя.
0.00 Вулічныя гонкі.
1.00, 4.50 Скарбы з каморкі.
2.00 Top Gear.
4.00 Маланкавыя катастрофы.
4.25 Сапраўдныя аферысты.

■ Будзем знаёмыя!

У ХІТ-ПАРАДЗЕ «СТО ПЕСЕНЬ ДЛЯ БЕЛАРУСІ» — НОВЫЯ ВЯДУЧЫЯ

У новым тэлевізійным сезоне прыхільнікаў культуралагічнага канала «Беларусь 3» чакае шмат сюрпрызаў, напрыклад, новыя вядучыя любімых праектаў, у ліку якіх і хіт-парад «Сто песень для Беларусі». Цяпер агучваць вынікі і прадстаўляць новыя кампазіцыі ў эфіры будуць Вольга Сацюк і Кірыл Ермакоў, добра знаёмыя гледачам як удзельнікі шмат якіх праектаў Белтэлерадыёкампаніі.

Такія змены ў праекце невыпадковыя. Раней Вольга сама прымала ўдзел у праграме і займала высокія прыступкі хіт-парада. Кірыл, у сваю чаргу, ствараў для праграмы «Наперад у мінулае» арыгінальныя аранжыроўкі і даваў новае жыццё забытым песням...

Нагадаю, што *Вольга Сацюк* — першая ўдзельніца міжнароднага дзіцячага конкурсу «Еўрабачанне» ад Беларусі. У 2003 годзе ва ўзросце дзесяці гадоў яна заняла на ім 4-е месца. Менавіта пасля гэтай падзеі пачалася яе тэлевізійная кар'ера: Вольга стала вядучай музычных праектаў медыяхолдынга — Усебеларускага тэлеконкурсу юных талентаў «Сузор'е надзей» і дзіцячага тэлевізійнага адборачнага конкурсу «Песня для Еўрабачання». У ліку іншых праектаў, на якіх яна працавала, праграма «Вас выклікае Спартландыя!» і міжнародны дзіцячы конкурс «Славянскі базар у Віцебску». У творчай біяграфіі Вольгі Сацюк таксама ўдзел у гуртах «Краскі», Prime Band і іншых музычных і тэлевізійных праектах.

У сваю чаргу *Кірыл Ермакоў* — папулярны музыкант, таленавіты аранжыроўшчык, малады кампазітар, уладальнік шматлікіх прэмій рэспубліканскіх і міжнародных вакальных конкурсаў. Тэлегледачам і радыёслухачам Кірыл добра вядомы як удзельнік і фіналіст рэспубліканскага конкурсу «Песня для Еўрабачання» (Белтэлерадыёкампанія), а таксама як лаўрэат і пераможца рэспубліканскага творчага радыёконкурсу «Маладыя таленты Беларусі» (Першы нацыянальны канал Беларускага радыё).

Вядучы скончыў музычную школу па класе скрыпкі і Рэспубліканскую музычную гімназію-каледж пры Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі па спецыяльнасці «Харавое дырыжыраванне». Зараз Кірыл атрымлівае вышэйшую адукацыю аранжыроўшчыка.

Кожны тыдзень Вольга і Кірыл будуць агучваць вынікі хіт-парада народных беларускіх песень у сучаснай апрацоўцы і прадстаўляць увазе тэлеаўдыторыі новыя кампазіцыі.

Нагадваем, што прагаласаваць за ўпадабаных артыстаў і песні ў іх выкананні можна на сайце тэлеканала «Беларусь 3»: www.3belarus.by.

СЕРАДА, 23 ВЕРАСНЯ

БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.50 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 23.30 Зона Х.
9.10, 22.00 Серыял «След».
10.00, 13.00, 16.00 90 секунд.
11.05, 20.00 Серыял «Бацька Мацвей».
12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-5».
13.10 Дзень у вялікім горадзе.
14.05 Серыял «Дзявочае паляванне». Заключная серыя.
15.15, 18.40 Навіны рэгіёна.
15.25, 0.20 Серыял «Адшпіліце рамяні».
17.35 Беларуская часінка.
19.30 Выступленні кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь.
21.00 Панарама.
21.40 Актуальнае інтэрв'ю.
0.05 Дзень спорту.

БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Тэлераніца.
9.00, 21.05 Тэлебарометр.
9.05, 16.00 «Арол і рэшка. На краі свету». Трэвел-шоу.
10.00, 21.10 «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
11.00 «Зразумець і абясшкодзіць».
11.35 Беларуская кухня.
12.20, 17.55 Дэтэктыў «Выпадковы сведка».
13.20, 22.10 Серыял «Косці».
14.15, 19.05 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
17.00, 23.05 «Пін-код».
22.05 Спортлато 5 з 36, КЕНА.
23.55 Серыял «Як я сустрэў вашу маму».

БЕЛАРУСЬ 3

7.20 «Дабраранак».
7.50, 11.00, 13.30, 19.20, 0.55 «Калейдаскоп».
8.00 «Цені знікаюць апоўдні». Драма. «Прышлыя людзі».
9.15, 17.35 «Жазэф Бальзамо». Драма.
11.10 «Катоўскі». Маст. фільм.
12.20 «Балканская пастка. Таямніца Сараеўскага замаху». Дак. фільм.
13.05, 23.30 «Святло далёкай зоркі». Памяці кампазітара Генрыха Вагнера.
13.40, 21.30 «Вайна і мір». Драма. «Андрэй Балконскі».
15.15 «Пад акампанемент настрою». Канцэрт расійскага акцёра, музыканта і спевака Яўгена Дзятлава.
17.10 «У гасцях у Барыса Аверына». Леанід Мазгавой, акцёр тэатра і кіно, заслужаны артыст Расіі.
19.35 «Цені знікаюць апоўдні». Драма. «Горкае шчасце».
20.45 «Калыханка».
21.05 «Дыя@блог». «Пра мову».
23.05 «Дыя@блог». «Пра прыгожае».
0.00 «Музычны арт-мадэрт».

БЕЛАРУСЬ 5

7.15, 7.45, 23.40 PRO спорт. Навіны.
7.30 Козел пра футбол.
8.00 Спорт-кадр.
8.30 Міні-футбол. Кваліфікацыйны турнір ЧЕ-2016. Плэй оф. Матч у адказ. Беларусь — Чэхія.
9.50 Хакей. Ліга чэмпіёнаў. 1/16 фіналу. Першы матч. «Фер'естад» (Швецыя) — «Лулу» (Швецыя).
11.45 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. «Баер» (Германія) — БАТЭ (Беларусь).
13.40 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
14.10 Хакей. Белнафтахім — чэмпіянат Беларусі. «Нёман» (Гродна) — «Металург» (Жлобін).
16.05 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Суёнсі» — «Эвертан».
18.00 Футбол. На шляху да ЧС-2018. Відэачасопіс.
18.30 Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
19.00 Авертайм. КХЛ.
19.25 Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Югра» (Ханты-Мансійск).
21.55 Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. «Вікторыя» (Пльзень, Чэхія) — «Дынама» (Мінск).

АНТ

6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 «Жыць здорава!»
10.25 «Кантрольная закупка».
11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00 Навіны спорту.
11.10 «Фазэнда».
11.55 «Модны прыгавор».
13.10 «Мужчынскае/Жаночае».
14.10 «Сам-насам з усімі».
15.05, 16.20 «Час пакажа».
16.50 «Давай пажэнімся!»
18.20 Серыял «Татавы дочкі».
18.50 «Няхай гавораць».
20.00 Час.
21.05 Серыял «Джуна».
23.05 Маст. фільм «Мяне клічуць Хан».
1.50 Начныя навіны.

СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.25 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
8.30 Драма «Боскія тайны сястрычак Я-Я».
10.40 «Салдаты 10». Серыял.
11.35 «Сямейныя драмы».
12.30 «Не хлусі мне!»
13.50 «Ежа багоў».
14.45, 23.20 «Водбліскі». Серыял.
16.50 «Мінск і мінчане».
17.35 «Званая вячэра».
18.35 «Дакументальны праект»: «Тайна выратавання».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 Камедыя «Ну ты і прыдурак!»
22.00 «Глядзець усім!»
23.00 «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
1.05 «Сакрэтныя тэрыторыі».

МІР

6.00 «180 хвілін».
9.00 «Зроблена ў СССР».
9.30, 1.10 Маст. фільм «Гараджане».
11.05 Маст. фільм «Дом, мілы дом».
13.00, 16.00, 19.00, 22.05, 23.10 Навіны (бягучы радок).
13.20, 2.45 Дак. серыял «Давайце разбярэмся!».
14.15 Серыял «Мужчына ўва мне».
16.20, 5.20 Дак. серыял «Іншы свет».
16.50 Дак. серыял «Зямля. Тэрыторыя загадак».
17.20 Серыял «Маўклівы сведка».
19.25 Серыял «Вострaў непатрэбных людзей».
22.15 Ток-шоу «Слова за слова».
23.25 Маст. фільм «Сям'я».
3.35 Маст. фільм «Вясёлая моладзь».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Раніца Расіі».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.35 «Пакой смеху».
12.30 Камедыя «Сабака на сене». 2-я серыя.
